Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

16 СНЕЖНЯ 2006 г.
СУБОТА
№ 268 (25857)

Кошт 310 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка:

«У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС МЫ ЗМОЖАМ ЗНЯЦЬ ВЕЛЬМІ МНОГІЯ ПЫТАННІ»

Шэраг важных рашэнняў прыняты па выніках пасяджэння Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, якое адбылося 15 снежня ў Маскве. У прыватнасці, зацверджаныя бюджэт Саюзнай дзяржавы на 2007 год, Праграма ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі дзяржаў — удзельніц Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2006—2007 гады, палажэнне аб Удзячнасці ВДС, падведзены вынікі выканання Праграмы ўладкавання знешняй граніцы Саюзнай дзяржавы.

Прэзідэнты Беларусі і Расіі пазітыўна ацанілі той факт, што саюзны бюджэт упершыню прыняты да пачатку новага фінансавага года. На думку кіраўнікоў дзяржаў, гэта сведчыць аб большай скаардынаванасці ў працы адпаведных органаў.

Да пачатку пасяджэння Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін правялі двухбаковыя перамовы, якія доўжыліся амаль тры гадзіны.

Каментуючы вынікі сустрэчы ў фармаце «адзін на адзін», беларускі лідар заявіў: «Мы сёння думалі вынесці «за дужкі» пытанні аб Канстытуцыйным акце і адзінай валюце, над якімі ідзе цяжкая, але плённая праца, і яшчэ некаторыя пытанні, аб якіх шмат пішуць. Але ў выніку нашых цяжкіх і працяглых перамоў мы быццам бы знайшлі тую нітку, за якую мы можам учапіцца. Думаю, у бліжэйшы час мы зможам зняць вельмі многія пытанні, якія былі такімі цяжкімі для нас. Таму мы так доўга вялі перамовы».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Казахстан гатовы пастаўляць у Беларусь нафту і газ

У Беларусі і Казахстана ёсць вялікія магчымасці для развіцця супрацоўніцтва ў энергетычнай сферы. Аб гэтым заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Беларусі Балат Іскакаў.

Паводле яго слоў, Казахстан гатовы пастаўляць у Беларусь нафту і газ. У маі 2005 года было заключана двухбаковае пагадненне аб развіцці паставак энергарэсурсаў. Застаецца толькі дамовіцца з краінамі-транзіцёрамі — Расіяй і Украінай. «Што датычыцца цаны, то яна ўстанаўліваецца рынкам, але абяцаю быць цалкам прымальнай», — дадаў ён.

Уладзімір ВАСІЛЬКОЎ, БЕЛТА.

Унучка «знайшла» дзеду ўзнагароды

Фота БЕЛТА.

Жыхар вёскі Сяльцо Полацкага раёна Аркадзь Мікалаевіч Каланда, якому за 80 гадоў, дзякуючы сваёй унучцы — 9-класніцы полацкай гімназіі Ганне атрымаў узнагароды, да якіх ён быў прадстаўлены падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Дзяўчына актыўна ўдзельнічала ў вышукова-патрыятычнай акцыі і вырашыла прасачыць за баявым шляхам 256-га гвардзейскага полацкага палка 51-й гвардзейскай стралковай дывізіі 2-га Беларускага фронту, у якім ваяваў яе дзед: перапісвалася з супрацоўнікамі архіваў, музеяў, у тым ліку і за межамі Беларусі.

У выніку высветліла, што Аркадзь Мікалаевіч у 1944 годзе менш чым за 2 месяцы быў прадстаўлены да ордэнаў Славы 2-й і 3-й ступеняў: за подзвіг каля літоўскай вёскі Лутрыні і за тое, што адбіў 8 контратак фашыстаў, паразіў агнявую кропку праціўніка і тым самым забяспечыў поспех аперацыі. Такім чынам, узнагароды, хоць і са спазненнем, знайшлі героя вайны. Да гэтага ветэран быў узнагароджаны двума медалямі «За адвагу» і двума «За баявыя заслугі»...

Гэты выпадак у мясцовым гарадскім ваенным камісарыяце лічаць унікальным.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ГАРАНТЫІ.

ЗА КОШТ СТАЛІЧНАГА БЮДЖЭТУ

Больш высокі ўзровень заробкаў і пенсій, а таксама — самая нізкая па Беларусі доля малазабяспечанага насельніцтва. Па традыцыі, усё гэта з'яўляецца адметнасцямі сталіцы. І ў той жа час не сакрэт: узровень жыцця ў буйнейшым горадзе краіны далёка не аднолькавы. Прычым большасць маламаёмных (і не толькі) мінчан па сутнасці пазбаўлены магчымасцяў атрымліваць некаторыя віды «звычайных» для жыхароў астатніх рэгіёнаў даходаў — да прыкладу, ад прысядзібнай гаспадаркі. Уласна кажучы, падобная акалічнасць і стала адной з прычын прыняцця гарадской праграмы сацыяльнай падтрымкі асобных катэгорый жыхароў Мінска. Што яна сабой уяўляе і якія змяненні тут адбудуцца з наступнага, 2007 года? Разабрацца з гэтымі пытаннямі мы паспрабуем з дапамогай начальніка ўпраўлення сацыяльнай дапамогі Камітэта па працы і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Наталлі Міхайлаўны РАСОЛЬКА.

Узровень «кошыка» — да года

На працягу апошніх гадоў у сталіцы назіраецца паступовы рост нараджальнасці. Факт сам па сабе цікавы. Але разам з тым нельга не заўважыць, што адважыцца на дзіця для многіх не так ужо і проста. І ў тым ліку — з-за «перспектывы» часовай страты зарплаты аднаго з бацькоў. Сапраўды, у такім выпадку прадугледжваецца выплата дзяржаўнай дапамогі па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Памер такой дапамогі складае 65 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму. Ці на сёння — 110 240 рублёў. Аднак даводзіцца прызнаць, што вырашыць усе матэрыяльныя праблемы такая дапамога не ў стане.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НАЛЕТА АБ'ЁМЫ ПАСТАВАК ГАЗУ НЕ ПАВІННЫ ЗМЕНШЫЦЦА

У структуры паліўна-энергетычнага балансу Беларусі вялікая частка прыпадае на прыродны газ. Яго выкарыстанне павялічваецца: за апошнія гады аб'ём паставак з Расіі ўзрос з 16 да 21 мільярда куб. метраў.

Як паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення стратэгічнага развіцця і інвестыцый Міністэрства энергетыкі Уладзімір Баброў, налета беларускім бокам прапрацоўваецца магчымасць экспарту з РФ 21,7 мільярда «кубоў». Карэктывы па цэнах на «блакітнае паліва» адбудуцца, аднак пра канкрэтныя расцэнкі гаворка пакуль не ідзе — зараз вядуцца адпаведныя перамовы, якія не зацягнуцца надоўга. Разам з тым, адзначыў Уладзімір Баброў, аб'ёмы паставак прыроднага газу, якія вызначаны на наступны год, хутчэй за ўсё амаль не зменяцца. Ён нагадаў, што ў 2004 годзе кантракт з «Газпрамам» быў падпісаны толькі ў чэрвені, тым не менш, паставакі прыроднага газу ажыццяўляліся.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ВЫЗНАЧАНА ДЗЕСЯТКА ЛЕПШЫХ СПАРТСМЕНАЎ ГОДА

Паводле вынікаў традыцыйнага апытання журналістаў, якое праводзілі газета «Спортивная панорама» і Нацыянальны алімпійскі камітэт /НАК/, вызначана дзесятка лепшых спартсменаў адыходзячага года.

Большасцю галасоў на першае месца пастаўлены сярэбраны прызёр зімовых Алімпійскіх гульняў-2006 у Турыне фрыстайліст Дзмітрый Дашчынскі. Другое месца заняла двухразовая алімпійская чэмпіёнка па акадэмічнаму веславанню Кацярына Карстэн, якая ў гэтым годзе чацвёрты раз стала чэмпіёнкай свету. Велагоншчыцы Наталлі Цылінскай (трэцяя пазіцыя) належыць абсалютны рэкорд — яна васьміразовая чэмпіёнка свету. Далей размясціліся: штангіст Андрэй Рыбакоў, лёгкаатлетка Алеся Турава, кідальнік молата Іван Ціхан, стралок Сяргей Мартынаў, чэмпіёнка Еўропы і свету па штурханню ядра Наталля Харанека, футбаліст Аляксандр Глеб. Дзесятку мацнейшых замкнула Рыта Турава, якая вызначылася ў гэтым сезоне ў спартыўнай хадзьбе. Лепшай беларускай камандай года названа зборная па хакею з шайбай.

Вячаслаў ДУТАЎ, БЕЛТА.

ВR3 ТЫС. 330 НА АДЗІН ЛОЖКА-ДЗЕНЬ

На аздараўленне школьнікаў у перыяд зімовых канікулаў выдзелена Br1,4 млрд са сродкаў сацстраху. Магчымасць адпачыць і аздаравіцца ў школьных лагерах у час зімовых канікулаў атрымаюць 68 тыс. дзяцей ва ўзросце 6—16 гадоў. Фінансаванне на гэтыя мэты прадугледжана з разліку Br3 тыс. 330 на адзін ложка-дзень. Зімовае аздараўленне дзяцей запланавана на працягу 6 дзён (у Мінску — 7 дзён).

БЕЛТА.

СПІРТАВЫЯ РЭКІ ЦЯКУЦЬ І ПА РЭЙКАХ

Супрацоўнікі ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце (УУСТ) вядуць актыўную барацьбу з незаконнымі пастаўшчыкамі алкагольнай прадукцыі ў нашу краіну.

Як паведаміў «Звяздзе» часова выконваючы абавязкі начальніка аддзела аховы правапарадку УУСТ Аляксандр Жылінскі, сёлета транспартнай міліцыяй было праверана больш за 50 тысяч цягнікоў, спынена 202 спробы ўвозу на тэрыторыю Беларусі спіртазмяшчальнай вадкасці. У кантрабандыстаў канфіскавана больш за 5 тысяч літраў «вогненнай вады» на агульную суму 57,5 мільёна рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

«МЫТНЫ ЎЗНОС» УЗРОС

Беларускія мытнікі датэрмінова выканалі гадавы план напаўнення рэспубліканскага бюджэту.

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК), айчынныя мытнікі пералічылі ў скарбонку краіны больш за 4 трыльёны 400 мільярдаў рублёў. У параўнанні з мінулым годам «мытны ўзнос» павялічыўся больш чым на 1 трыльён рублёў. Найбольшую долю мытных паступленняў у дзяржбюджэт складаюць: падатак на дабаўленую вартасць (2 трыльёны 446 мільярдаў рублёў) і імпартная пошліна на ўвезеныя ў Беларусь тавары (1 трыльён рублёў).

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ВАДЗІЦЕЛЯ ПРЫВЯЗАЛІ ДА ДРЭВА...

У незайздроснай сітуацыі апынуўся мінчанін, якога крымінальнікі кінулі ў лесе, прывязаўшы да дрэва.

Няшчасце здарылася з мужчынам, які падвозіў на «Міцубісі» чацвярых невядомых: а палове трэцяй ночы паблізу пасёлка Сосны яму накінулі на шыю вяроўку і пад пагрозай нажа забралі грошы, сотавы тэлефон, банкаўскую картку. Злачынцы завезлі сваю ахвяру ў лес паблізу вёскі Возера Уздзенскага раёна, прывязалі да дрэва, а самі зніклі на яго аўтамабілі. Знайшлі зламыснікаў праваахоўнікі ўжо ў Брэсце: у ходзе ўведзенага плана «Перахват» у расшукваемай машыне былі затрыманы двое 19-гадовых непрацуючых мясцовых жыхароў. Іх саўдзельнікі — таксама двое непрацуючых 19-гадовых брастаўчан — затрыманы.

Ігар ГРЫШЫН.

ДАРОГА «ЗБІРАЕ» АХВЯРЫ

Раніцай у Віцебску зафіксавана буйное дарожна-транспартнае здарэнне, у якім загінулі і пацярпелі некалькі чалавек.

Каля пяці гадзін раніцы рабочы аднаго з прадпрыемстваў на аўтамабілі «ДЭУ» выехаў на галоўную дарогу, па якой рухаўся «Масквіч». Машыны не змаглі размінуцца і сутыкнуліся. У выніку вадзіцель і непрацуючы атрымалі траўмы і былі змешчаны ў бальніцу, а вось яшчэ адна жанчына і студэнтка Віцебскай дзяржаўнай ветэрынарнай акадэміі загінулі. Усе — мясцовыя жыхары.

Аляксей ЦІТОЎ.

Увага: «прамая лінія»!

ДАПАМАЖЫЦЕ ПАЗВАНОЧНІКУ

Як трэба паводзіць сябе, каб не пакутаваць ад болю ў спіне? Чаму захворванні пазваночніка з'яўляюцца такімі распаўсюджанымі, нават сярод маладых? Ці могуць дапамагчы паясніцы шырока разрэкламаваныя мазі? Пра гэта і многае іншае, напрыклад, пра сучасныя аперацыі, якія робяць айчынныя нейрахірургі, расказа падчас «прамой лініі», якая адбудзецца ў рэдакцыі нашай газеты, ***Арнольд Фёдаравіч СМЕЯНОВІЧ, загадчык нейрахірургічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук, прафесар.***

«Прамая лінія» адбудзецца ў пятніцу, 22 снежня, па нумарах: 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 287 18 29 і 287 18 36.

«БЕРАСТАВІЦА»: АДНОЎЛЕНЫ РУХ

Уязны комплекс грузавога транспарту аўтамабільнага пункта пропуску «Бераставіца» адкрыўся пасля рэканструкцыі.

20 снежня пачне работу ўязны пасажырскі комплекс пункта пропуску «Брузгі».

БЕЛТА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

20 снежня 2006 г. у 10.00 у зале пасяджэння· Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца заключнае пасяджэнне пятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

РУХ ЦЯГНІКА МІНСК—КІШЫНЁЎ З 18 СНЕЖНЯ ЧАСОВА АДМЯНЯЕЦЦА

Рух пасажырскага цягніка 71/72 па маршруту Мінск—Кішынёў з 18 снежня 2006 года часова адмяняецца, паведаміў саветнік гендырэктара ДП «Чыгунка Малдовы» Анатоль Цвяткоў.

З 25 снежня 2006 года для забеспячэння пасажырскіх зносінаў паміж Мінскам і Кішынёвам да цягніка Кішынёў—Санкт-Пецярбург будуць далучацца два прычапныя вагоны «Кішынёў—Мінск» праз дзень, па цотных чыслах.

Андрэй ГУСІН, БЕЛТА.

Актуальнае інтэрв'ю

УЛАДА — У ІНТАРЭСАХ НАРОДА



Важнай падзеяй адыходзячага года стала змяненне структуры ўрада, накіраванае на павышэнне эфектыўнасці яго дзейнасці. У адрозненне ад раней дзеючай, у новай структуры ліквідаваны дубліруючыя звёны, трохступеньчатая сістэма кіравання заменена двухступеньчатай. Асноўнымі органамі сталі міністэрствы і дзяржаўныя камітэты. Выбудавана дакладная сістэма вертыкалі ўлады — ад урада да райвыканкамаў.

У інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр ПАПКОЎ** расказаў, што ўсе новаўвядзенні накіраваны на вырашэнне галоўнай задачы — зрабіць сістэму ўлады адладжанай, надзейнай і ў той жа час успрымальнай да інавацый у кіраванні, здольнай перабудоўвацца прымяняльна да новых умоў развіцця грамадства.

Галоўная задача, якую паставіў Аляксандр Лукашэнка пасля прэзідэнцкіх выбараў, — гэта павярнуць уладу тварам да народа. Пачынаць гэты працэс ён запатрабаваў з верхніх эшалонаў улады — Савета Міністраў, міністэрстваў і ведамстваў. Прэзідэнт Беларусі паставіў задачу дэбюракратызаваць дзяржаўны апарат, максімальна наблізіць уладу да інтарэсаў чалавека, задавальнення яго штодзённых патрэб і запытаў без валакіты і фармалізму.

Як падкрэсліў Аляксандр Папкоў, толькі на аснове прадуманай, мэтанакіраванай палітыкі па няўхільнаму павышэнню якасці жыцця людзей можна разлічваць на пастаянную шырокую і цвёрдую падтрымку сацыяльна-эканамічнага курсу, які праводзіцца ў краіне.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Да чытача

Самы час... Развозіць падарункі

Як ні круці, а прыемна што-небудзь выйграць. Хоць па дробязі. Калі ж «па-буйнаму»... Кшталту тэлевізара, халадзільніка «Атлант»... Да таго ж, калі табе іх да хаты прывязуць, урачыста ўручаць...

Сведчым: учора сапраўднае свята падарыла «Звязда» Івану Вікенцьевічу Новіку з в. Рагозніца Мастоўскага раёна і Тамары Іванаўне Козел з Лясхавічаў (рэпартаж з сустрэч чытайце ў наступным нумары за 19 снежня).

У той жа дзень маленькі звяздоўскі дэсант зноў накіруецца ў дарогу, з кароткімі сяброўскімі візітамі ён плануе спыніцца ў Гомелі, з вялікім (пачатак а 14-й гадзіне) — у, кажуць, зусім не далёкім ад яго мястэчку Шарпілаўскае, жыхар якога Дзяніс Адамавіч Заіка выйграў веласіпед. Самы час уручыць — будзе на чым развозіць падарункі да Калядаў і Новага года.

Валянціна ДОЎНАР, Інга МІНДАЛЁВА, Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Віктар МАТЧУК, кіраўнік Ровенскай абласной дзяржадміністрацыі:

«На памежжы жывуць людзі, і яны павінны адчуваць клопат аб сабе ўрадаў краін і мясцовых органаў улады»

На чарговую сустрэчу кіраўнікоў прыгранічных абласцей Беларусі і Украіны ў Брэст прыехалі госці з Жытомірскай, Кіеўскай, Валынскай, Ровенскай абласцей суседняй дзяржавы і Гомельскай вобласці. Нарада ў падобным фармаце праходзіла ў чацвёрты раз. Адным з асноўных пунктаў парадку дня было, як заўсёды, эканамічнае супрацоўніцтва бакоў. І хоць сёлетнюю лічбу тавараабароту паміж нашай рэспублікай і Украінай — 2,2 мільярда долараў — называлі рэкорднай за апошнія паўтара дзесятка гадоў, на думку абодвух бакоў, паказчыкі павінны быць большымі.

Ровенскі губернатар лічыць, што людзі з прыгранічных раёнаў не даруюць уладным структурам, калі тыя не зробяць усё магчымае, каб спрасціць сямейныя, суседскія стасункі. Свайго калегу падтрымаў і брэсцкі калега Канстанцін Сумар. Паміж абласцямі на гэтай сустрэчы быў падпісаны доўгатэрміновы дагавор аб супрацоўніцтве.

Канстанцін Сумар шмат увагі падчас выступлення ўдзяліў развіццю прыгранічнага турызму. І, варта зазначыць, знайшоў падтрымку ва ўкраінскіх калег. Кіраўнік Валынскай абласной дзяржадміністрацыі Уладзімір Бондар зрабіў акцэнт на культурным, інфармацыйным супрацоўніцтве. Першы дэсант брэсцкіх журналістаў пабываў нядаўна на Валыншчыне. Уладзімір Маёраў, намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама ў сваім выступленні закрануў праблемы супрацоўніцтва праваахоўных органаў... Наступную сустрэчу кіраўнікоў прыгранічных абласцей вырашана правесці ў чэрвені будучага года з удзелам старшынь мытных камітэтаў рэгіёнаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

АДКУЛЬ У ПІВЕ РТУЦЬ?

У мінулым месяцы на старонках нашай газеты расказвалася аб тым, што жыхар адной з вёсак Гомельскага раёна, купіўшы ў магазіне бутэльку піва, выявіў у ёй ртуць, якая трапіла ў яго арганізм. Спецыялісты правялі абследаванне тэхналагічных працэсаў на ААТ «Рэчыцапіва», было ўстаноўлена, што ў бутэлькі ні ртуць, ні іншыя рэчывы пры вытворчасці і разліву напою трапіць ніяк не маглі. Вывад такі: нехта недзе спецыяльна, хутчэй за ўсё са злым намерам учыніў указаную шкоду. Але як устанавіць асобу зламысніка?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

БЕЛАРУСЬ СКАРОЦІЦЬ ІМПАРТ ВІНАГРАДНЫХ ВІН У 2,3 РАЗА

Урад Беларусі зацвердзіў квоты на імпарт.

У параўнанні з 2006 годам аб'ём імпарту гарэлкі захаваецца на тым жа ўзроўні, каньяку ў ёмістасцях больш як 2 л — узрасце ў 2,7 раза, брэндзі — у 1,4 раза, каньяку ў ёмістасцях менш як 2 л — скароціцца ў 2,8 раза. Таксама ў 2,3 раза скарочана квота на імпарт вінаградных він, улічваючы развіццё ўласных вытворчасцяў па разліву.

БЕЛТА.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА «ЗВЯЗДУ» НА 2007 ГОД

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАРЛАМЕНТ КІРГІЗІІ ПАСТАВІЎ ПЫТАННЕ АБ МЭТАЗГОДНАСЦІ ЗНАХОДЖАННЯ Ў КРАІНЕ АВІЯБАЗЫ ЗША

Парламент Кіргізіі абавязаў урад «разгледзець мэтазгоднасць» далейшага знаходжання ў краіне авіябазы ВПС ЗША. Гэта звязана з трагічным інцыдэнтам у міжнародным аэрапорце Бішкека Манас, дзе 6 снежня амерыканскі вайсковец застрэліў кіргізскага грамадзяніна. Адпаведная пастанова, распрацаваная парламенцкім камітэтам па абароне і бяспецы, прынята ў пятніцу большасцю галасоў.

Дэпутаты заклікалі ўрад перагледзець умовы пагаднення з урадам ЗША аб «статусе і парадку знаходжання ваеннага і грамадзянскага персаналу ЗША на тэрыторыі Кіргізіі». Парламент запатрабаваў ад ЗША выдачы вінаватага вайскоўца праваахоўным органам Кіргізіі «для правядзення адпаведных следчых дзеянняў у рамках заведзенай крымінальнай справы». Акрамя таго, на думку дэпутатаў, для правядзення балістычнай экспертызы неабходна «арганізаваць выдачу табельнага пісталета», з якога былі зроблены стрэлы. Дэпутат кіргізскага парламента Меліс Эшымканаў заявіў, што незадоўга да забойства амерыканскі вайсковец прыбыў з Ірака.

50 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ ЗА ВЫРАТАВАННЕ ПЛАНЕТЫ

Амерыканскія вучоныя заплацяць прыз у 50 тысяч долараў таму, хто створыць сістэму, здольную абараніць Зямлю ад астэроіда Апофіс, які наблізіцца на небяспечную адлегласць да нашай планеты ў 2029 і 2036 гадах.

Конкурс на лепшую проіастэроідную сістэму абароны Зямлі быў арганізаваны Планетарным таварыствам ЗША сумесна з Еўрапейскім касмічным агенцтвам і NASA. Менавіта паўторнае набліжэнне Апофіса (у 2036 годзе) да Зямлі пад уплывам сілы прыцяжэння нашай планеты выклікае ў асяроддзі вучоных апасенні: верагоднасць сутыкнення па касмічных мерках даволі высокая — каля адной шасцітысячнай. Адметна, што шэраг назіральнікаў ужо паспелі адшукаць у прадказаннях Нострадамуса ўказанні на тое, што канец свету павінен адбыцца менавіта падчас набліжэння Апофіса да Зямлі.

ЕС ЗАЧЫНЯЕ ДЗВЕРЫ ПЕРАД ТУРЦЫЯЙ

Лідары Еўрасаюза, якія сабраліся на двухдзённы саміт у Бруселі, адобрылі рашэнне кіраўнікоў МЗС 25 краін — членаў гэтай арганізацыі часткова «замарозіць» перамовы аб уступленні Турцыі ў ЕС.

Перапыніць перамовы, якія вядуцца з кастрычніка мінулага года, Еўракамісія рэкамендавала Савету міністраў ЕС па васьмі з 35 тэхнічных пунктаў. Усе яны звязаны з выкананнем Анкарой абавязацельстваў па Кіпру і датычацца свабоднага перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталаў, рыбалоўства, сельскай гаспадаркі, транспарту, мытні і гандлю. Кіпрскае пытанне з'яўляецца адным з самых вострых у адносінах паміж Кіпрам і ЕС.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже в г. Бресте, ул. Красногвардейская, 129: **Лот № 1:** здание арматурного цеха с кран-балкой (427,0 кв.м). Нач. цена 290 000 000 бел. руб. с НДС. В г. Гомель, пер. Строителей, 3: **Лот № 1:** здание РБУ с наклонной галереей, емкостями для цемента, бетоносмесителем и здание компрессорной, площадкой козлового крана, козловым краном (площадь 563,0 кв.м). Нач. цена 200 000 000 бел. руб. с НДС. **Лот № 2:** здание котельной с паровыми котлами (93 кв.м). Нач. цена – 23 000 000 бел. руб с НДС. **Лот № 3:** здание арматурного цеха с двумя мостовыми кранами (2125 кв.м). Нач. цена 230 000 000 бел. руб с НДС. Размер задатка по каждому лоту составляет 10% от начальной цены и перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Договор купли–продажи заключается в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома на основании заявления победителя аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 26 декабря 2006 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25 декабря 2006 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Телефоны: (8-017) 224-61-34, 234-56-23, 237-80-02. Сайт в Интернете: www.rlt.by.

Фота Мары ЖЫЛІНСКАЙ.

Паштальён вёскі Цімкавічы Капыльскага раёна Валянціна ЧАРНЯЎСКАЯ.

«ЗВЯЗДА» Ў САЮЗЕ З ПАШТАВІКАМІ

Паважаныя работнікі паштовай сувязі! Рэдакцыя газеты «Звязда» мае даўнія партнёрскія сувязі з паштавікамі, якія традыцыйна з'яўляюцца добрымі памочнікамі падчас падпісной кампаніі на старэйшае беларускамоўнае выданне.

Нам хацелася б удасканаліць прынцып узнагароджання раённых вузлоў паштовай сувязі, аддзяленняў сувязі і паштальёнаў за актыўны ўдзел у падпісцы на газету «Звязда» на 1-ы квартал і I паўгоддзе 2007 года і ўстанавіць адпаведны прызавы фонд у наступных намінацыях ва ўсіх абласцях і горадзе Мінску.

Сярод раённых вузлоў паштовай сувязі
1-е месца — 8 базавых велічынь;
2-е месца — 7 базавых велічынь;
3-е месца — 5 базавых велічынь
Сярод аддзяленняў сувязі
1-е месца — 6 базавых велічынь;
2-е месца — 5 базавых велічынь;
3-е месца — 3 базавыя велічыні.
Сярод паштальёнаў
1-е месца — 4 базавыя велічыні;
2-е месца — 3 базавыя велічыні;
3-е месца — 2 базавыя велічыні

Спадзяёмся, што новы фармат у прэміраванні лепшых супрацоўнікаў паштовай сувязі на падпіску на газету «Звязда» будзе больш справядлівым і паслужыць павелічэнню чытацкай аўдыторыі на старэйшае ў краіне, адзінае штодзённае беларускамоўнае выданне, якому ў наступным годзе споўніцца 90 гадоў.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Чалавек—чалавеку

І адродзяцца нашы святы!

Не ведаю, як іншых, а мяне дык заўсёды захаплялі песні, гульні, звычкі беларускага народа. Асабліва — традыцыі святкавання Калядаў і Новага года.

Добра памятаю, як рыхтаваліся да іх у нашай сям'і: з тых часоў яшчэ захоўваю некалькі вельмі дарагіх для мяне ёлачных цацак. Крамных... Астатнія — мы з мамай рабілі самі. Апроч таго прыбіралі ў хаце, пяклі і варылі вельмі смачныя стравы: «збіралі» прашчураў на першую куццю, святкавалі Вадохрышча...

Само сабой, падросшы, разам з сяброўкамі варажылі... Але самым чароўным, самым захапляючым было калядаванне. Помніла яго да драбніц, расказвала іншым і вельмі шкадавала, што пры савецкім часе ўсё забаранілі. А потым рашыла, што хоціць сядзець, хоціць проста гаварыць, што знікае духоўная спадчына, трэба нешта рабіць.

Перш-наперш я схадзіла ў суседнюю вёску да Марты Кабарыхі «па песні». Затым з двух тоўстых лістоў кардону выразала вялізную звязду, размалявала, упрыгожыла яе бліскучымі гірляндамі (раней, дарэчы, іх рабілі з дрэва). Пасярэдзіне прыклеіла невялічкі абразок — Божая маці з Ісусам Хрыстом на руках. Вакол іх прымацавала вяночак з папяровых кветак.

Змайстравала маску казе. Да зімовай шапкі прыладзіла драцяныя рожкі і абшыла іх чорнай тканінай. Паралельна пісала сцэнарый з віншаваннямі ў кожную хату, з адмысловымі пажаданнямі ўсім гаспадарам і «перасыпала» ўсё тонкім гумарам...

Заставалася самае цяжкае — угаварыць вяскоўцаў... пайсці па хатах. Нехта казаў, што стары ўжо, нехта — што часу не мае, нехта, што людзі асудзяць. Вольных, маладых, у выніку, сабралася мала, але якіх жа таленавітых: Аляксандра Сягай, Людміла Махахей, Ірына Стрэчань (яна, дарэчы, спявае ў царкоўным хоры), Мікалай Дуко, Сяргей Аляксандровіч, загадчык Дома культуры Віталь Новік. Ён яшчэ і з касцюмамі нам дапамог.

Карацей, мы сталі рэпеціраваць, рыхтавацца ў людзі. Рабілі гэта ў кожную вольную хвіліну, і таму, відаць, усё ў нас атрымалася цікава, урачыста, весела. Каледаваць пайшлі ў 15 гадзін, а закончылі амаль апоўнач. І то пабылі не ва ўсіх, — стаміліся: думаць не думалі, не чакалі, што прымаць нас будуць з гэтакай радасцю, з цікавасцю, з павагай і задавальненнем! Нас не ведалі чым частаваць і дзе пасадзіць, надзялялі найлепшымі прысмакамі, нас вельмі прасілі прыходзіць яшчэ — у наступныя гады і Каляды.

Мы — абяцалі і ведалі, што ў наступныя — нам будзе лягчэй: ёсць жа і вопыт, і сцэнарый, ёсць багаты матэрыял. Былі б толькі ахвотнікі!

... Гэты ліст я пішу менавіта для іх, для тых, хто таксама, як некалі я, мо, «хварэе» нашымі святамі, марыць адрадзіць забытыя амаль традыцыі. Тэлефануйце (80163 48-92-24) — з радасцю падзялюся вопытам. А то і дашлю наш сцэнарый ці словы песень.

Сафія Канстанцінаўна КАБАРЫХА,
в. Паланечка, Баранавіцкі раён.

Па вашай просьбе

Ад слова да слова

Абабіцца — (разм.) пра мужчыну: стаць бесхарактарным, дробязным; пра жанчыну: стаць неахайнай, апусціцца.

Бібліяфіл — аматар і збіральнік кніг.

Будуар — гасцёўня гаспадыні ў багатым доме для неафіцыйных прыёмаў, а таксама абстаноўка такой гасцёўні.

Вага-брута — агульная вага тавару, уключаючы сам тавар і яго ўпакоўку.

Вага-нета — чыстая вага тавару без упакоўкі.

Галюцынацыя — падман пачуццяў, памылковае ўспрыманне ў выніку псіхічнага расстройства.

Гуманны — накіраваны на карысць іншых; чалавекалюбівы, спагадлівы.

Жакей — прафесійны наезнік на скачках, спецыяліст па падрыхтоўцы і выпрабаваннях верхавых коней.

Жардыньерка — падстаўка, скрыня або кашолка для пакаёвых кветак.

Зухаваты — бойкі, удалы, маладзецкі.

Імпічмент — працэдура пазбаўлення паўнамоцтваў вышэйшых службовых асоб, якія дапусцілі грубае парушэнне закона.

Інгаляцыя — лячэнне ўдыханнем распыленых лекавых рэчываў, пары.

Прэйскурант (англ. price-list) — даведнік, пералік цэн на тавары і паслугі, якія прадастаўляюцца пакупнікам.

Прэфіцыт — перавышэнне даходаў над расходамі.

Рэк-джобінг (англ. rack jobbing) — дагавор, па якому буйны гандлёвы цэнтр, універмаг, супермаркет прадастаўляюць месца ўнутры свайго памяшкання ў арэнду прадпрымальніку.

Сурагат — недабраякасны падроблены тавар.

Фаст-фуд — харчовыя паўфабрыкаты, якія патрабуюць мінімальных намаганняў для прыгатавання.

Пасля пісьма

Хай гарыць зялёнае святло!

«Вёска Крыніца Маладзечанскага раёна вядома з даўніх часоў — і жалобнымі падзеямі і добрымі. Прынамсі, тут стаяла карчма, працаваў вадзяны млын, побач — праходзіў гасцінец Мінск—Маладзечна—Вільня, тут, пры вызваленні, ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінула шмат чырвонаармейцаў, згарэла шмат «трыццацьчацвёрак», — пісаў у рэдакцыю жыхар гэтай вёскі Васіль Сямёнавіч Завадскі. Але, на жаль, зусім не для таго, каб пахваліцца багатай гісторыяй. Біў, як кажуць, трывогу: у Крыніцы — цэнтральная сядзіба СВК «Усход», у Выверах — на другім баку гасцінца і Лібава-Роменскай чыгункі — сярэдняя школа. Праз дарогу (асабліва летам, з электрычкі, да лецішчаў і вадаёмаў) вымушаны пастаянна хадзіць людзі — і старыя, і малыя. Аўтамабілісты ж, нават у пазначаных месцах далёка не заўсёды збаўляюць хуткасць, не даюць прайсці пешаходам. Не раз, пісаў сп. Завадскі, на пераходах адбываліся дарожна-транспартныя здарэнні, а то і сапраўдныя трагедыі. Пасля апошняй — загінула зусім маладая жанчына — у чыёйсьці светлай галаве з'явілася ідэя паставіць светлафор, асвятляць пераходы ноччу.

І работы гэтыя распачалі — накапалі ям. Гэта значыць, да старых перашкод нарабілі новых. Людзі думалі, што гэта ж часова, справа дзён. А высветлілася, што... месяцаў, бо рабочыя з аб'екта зніклі...

Ліст чытача па просьбе рэдакцыі быў разгледжаны ў Маладзечанскім райвыканкаме. Як патлумачыў выконваючы абавязкі яго старшыні сп. Ідэльчык, светлафоры на аўтадарозе «Мінск—Маладзечна—Мядзель» у раёне вёскі Крыніца ўстаноўлены, пытанне вырашана.

То зялёнага святла і добрай дарогі!

Свой погляд

«Не пры нас гэта пачалося...»

Дажыў-такі: адбылося, пачалося хоць нейкае наступленне на тых, хто гоніць атруту, хто травіць людзей. Зачыняць сталі іх лавачкі, штрафаваць, паказваць па тэлевізары. Але ж гэта-га, думаю, мала.

Так, гналі ў нас гарэліцу. Але ж, людцы добрыя, успомніце, якую і з чаго?! З хлеба, з бульбы. Ратавала яна ад прастуды, ад стомы, лячыла жываты. Без яе ні адно вяселле не абыходзілася, ніводныя хрэсьбіны ці ўлазіны. Мяккая была, пахучая. Чарку-другую ўзяў і можаш весяліцца ці нешта рабіць. Ні табе сэрца забаліць, ні галава. Калі і перабярэш... Для сябе людзі гналі, для сваіх гасцей...

Потым — на продаж сталі. А для чужых можна ж ужо не старацца, можна любой атруты ўвярнуць, абы больш атрымалася, абы мазгі задурманьвала. «Сахаруха» пайшла. А цяпер і наогул — тэхнічныя спірты, сурагаты. Травяцца людзі, нішчацца. Замаруджанае (масавае!) забойства ідзе. І што? За яго (прытым цалкам свядомае) дастаткова штрафу?

Не і яшчэ раз не! Іншыя законы патрэбны. Я, асабіста, для гэтых гора-самагоншчыкаў прасіў бы да 15 гадоў турмы...

А з другога боку трэба наладзіць выпуск якасных він (расце ж у нас вінаград!), не перашкаджаць рабоце праверaных лікёра-гарэлачных заводаў. Бо «на сухую» ў Беларусі бяседы ладзіцца не будуць: не з нас гэта пачалося, не пры нас хай скончыцца.

А вось тое, што творыцца цяпер, адысці павінна.

Д. П.
Буда-Кашалёўскі раён.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На наступным тыдні асноўную нагрузку на «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (222-70-80) возьмуць на сябе:

18 снежня — вядучы спецыяліст аддзела медыцынскай аховы пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Алег Анатольевіч ЛАПО.

19 снежня — намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Галіна Дзмітрыеўна ЛОСЕВА.

20 снежня — намеснік галоўнага ўрача па хірургічнай дапамозе Мінскай абласной клінічнай бальніцы Яраслаў Леанідавіч ПЕРАЛЫГІН.

21 снежня — галоўны ўрач Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Таццяна Фёдараўна МАРТЫНАВА.

22 снежня — галоўны спецыяліст упраўлення кадравай палітыкі, устаноў адукацыі і знешніх сувязяў Міністэрства аховы здароўя Марына Анатольеўна ПЕЧАНКО.

Званкі прымаюцца з 9 гадзін раніцы да 17.30 з перапынкам на абед з 13.00 да 14.00. У графіку дзяжурстваў магчымыя змяненні.

Створаны сінтэзатар беларускага маўлення

У Беларусі пры падтрымцы ЮНЕСКО створана камп'ютарная праграма, якая сінтэзуе беларускае маўленне і дапамагае сляпым дзецям без перашкод вывучаць родную літаратуру.

Як было адзначана на пасяджэнні Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах ЮНЕСКА, у рамках праекта «Электронная бібліятэка школьніка» кампаніяй «Сакрамент IT» пры падтрымцы Бюро ЮНЕСКО ў Маскве была вырашана важная задача — аўтаматычнае агучванне любога рускага або беларускага тэксту ў электронным фармаце.

БЕЛТА.

ЗВЯЗДА

Прамая лінія

ВАМ — ІЛЬГОТА. ПАДАТКОВАЯ

Карэспандэнт Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё Максім УГЛЯНІЦА і карэспандэнт «Звязды» гутараць з начальнікам упраўлення падаткаабкладання грамадзян, дэкларавання даходаў і маёмасці Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Марынай ГРЫГАРЧУК

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 15 снежня.)

— У выпадку, калі ў фізічнай асобы ёсць толькі асноўнае месца працы і плюс да гэтага нейкія непастаянныя падзаробкі, — гэта трэба ўказваць у дэкларацыі?

— Калі пры атрыманні даходаў па гэтых падпрацоўках, па дагаворах фізічная асоба выплачвала падатак па стаўцы 20 працэнтаў, а такое права ў яе ёсць, то такія даходы ў сукупны гадавы даход не ўключаюцца. А вось калі фізічная асоба атрымлівала даход, маючы асноўнае месца працы, і плюс да гэтага атрымлівала даходы ад іншай фізічнай асобы, якія належаць падаткаабкладанню, то незалежна ад таго, які памер даходу быў атрыманы па месцы працы, нават у выпадку, калі сукупны гадавы даход за 2006 год не перавысіў 7 млн 360 тысяч рублёў, усё роўна неабходна падаваць дэкларацыю.

— Марына Алегаўна, а як можна праверыць тое, якую суму адна фізічная асоба заплаціла іншай?

— Я не думаю, што ў нас людзі ходзяць па вуліцы і перадаюць адзін аднаму грошы. Калі размова ідзе пра нейкія прыватныя мерапрыемствы, нейкіх падарунках на дні нараджэнні, вяселлі, то закон устанавіў, што даходы, атрыманыя ў выніку дарэння ад фізічных асоб, рэзідэнтаў рэспублікі ў межах да 500 базавых велічынь, не абкладваюцца падаходным падаткам. Што ж датычыцца даходаў, якія выплачваюцца за аказанне нейкіх паслуг у прыватным парадку, аплаты хатніх работнікаў, то апошнія самі зацікаўленыя ў тым, каб іх праца была афіцыйнай. Працоўныя дагаворы паміж фізічнымі асобамі рэгіструюцца ў выканкамах, робіцца адпаведны запіс у працоўную кніжку. Зараз ужо ўсе разумеюць, што не заключыўшы дагавор, чалавек пазбаўляецца падстрахоўкі таго, што яму не заплацяць грошай. Ён не зможа нават атрымаць іх па суду, калі ўзнікне канфліктная сітуацыя з наймальнікам, не зможа дабіцца кампенсацыі свайго заробку. З іншага боку, наймальнік таксама зацікаўлены ў заключэнні дагавора, каб агаварыць усе ўмовы па абавязках наёмнага работніка.

— На ваш погляд, ці павысілася культура выплаты падаткаў нашымі грамадзянамі?

— У параўнанні з тым, што было 5—6 гадоў таму, канешне, зараз грамадзяне сталі больш граматнымі і адказнымі па выплаце падаткаў, у запаўненні дэкларацый, падачы дэкларацый. З іншага боку, мы імкнёмся і заканадаўства строіць такім чынам, каб чалавеку было нявыгадна не плаціць падаткі. Напрыклад, фізічная асоба мае права вылічыць са свайго даходу расходы, што звязаны з будаўніцтвам жылога дома. Чалавек наймае рабочых у прыватным парадку, каб яны выканалі работы пры будаўніцтве яго дома. Калі раней ён мог заплаціць ім наяўнымі грашамі, ніяк гэта не дэкларуючы, то зараз яму гэта нявыгадна. Не заключыўшы дагавор, не адлюстраваўшы суму выплачаных рабочым грошай, ён не атрымае вылік, не атрымае льгот. Мы стараемся ў заканадаўстве прадумваць такія моманты, каб чалавеку самому было выгадна выплачваць падаткі.

— Даволі часта сустракаюцца сітуацыі, калі чалавек атрымлівае невялікія сумы, не дэкларуе іх і не ведае, у што гэта потым можа выліцца...

— Па-першае, падаткі ў нас выплачваюцца з рубля і няма такога, што да нейкай пэўнай сумы можна падаткі наогул не плаціць, ці не ўтрымліваць. Так, у нас ёсць нейкі неабкладаемы даход, неабкладаемы мінімум для кожнага чалавека — гэта дванаццаць базавых велічынь у год. Але такія вылікі прадастаўляюць толькі падатковы орган. Калі вы атрымліваеце прыватныя пераводы з-за мяжы, нават невялікую суму, патэлефануйце ў інспекцыю і пракансультуйцеся , каб быць упэўненымі, што потым ніхто да вас не прад'явіць ніякіх прэтэнзій. Сапраўды, такіх звестак да нас прыходзіць вельмі шмат. Але, у першую чаргу, увага надаецца вялікім сумам падатку. А калі пераводы невялікія, то кантроль за імі ажыццяўляецца ў апошнюю чаргу, і падатковыя органы могуць выклікаць іх атрымальнікаў праз паўгода-год. За гэты час пеня можа нарасці роўная нявыплачанаму падатку.

— Хто не абавязаны, але можа прыйсці па свайму жаданню ў падатковую інспекцыю, ды яшчэ і атрымаць грошы?

— Я крыху вас папраўлю: магчыма, тыя людзі, якія абавязаны прыйсці ў падатковую інспекцыю, таксама маюць права на льготы і вылікі. Ёсць фізічныя асобы, якім абкладаемы даход будзе памяншацца. Кожная фізічная асоба, якая будзе падаваць дэкларацыю, зрэшты, як і кожная фізічная асоба, якая наогул атрымлівае даходы ў Беларусі, мае права вылічваць са свайго даходу 12 базавых велічынь у год на сябе як плацельшчыка, па 2 базавыя велічыні на кожнае дзіця або дзіця і ўтрыманца (напрыклад, студэнты дзённай формы навучання для сваіх бацькоў будуць утрыманцамі да канца навучання). Ёсць у нас яшчэ асобныя катэгорыі грамадзян, напрыклад, інваліды першай і другой груп, Героі Савецкага Саюза, Героі Беларусі, кавалеры ордэна Славы і асобы, што пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС, якія маюць права вылічваць са свайго даходу ў год 120 базавых велічынь. Гэта стандартныя вылікі, яны прадастаўляюцца па месцы асноўнай працы ўсім. У выпадку, калі ў кагосьці не было месца асноўнай працы на працягу 2006 года, а ён працаваў недзе па дагаворах, то такія вылікі яму не прадастаўляюцца. Такі чалавек мае права прыйсці ў падатковую інспекцыю, падаць дэкларацыю і яму будуць прадастаўлены гэтыя вылікі і пералічаны падаткі. У нас ёсць яшчэ так званы сацыяльны вылік, права на які маюць фізічныя асобы, што трацілі на працягу 2006 года грашовыя сродкі на аплату навучання — сваё, сваіх дзяцей, мужа ці жонкі. Для таго, каб атрымаць такі вылік, неабходна толькі адна ўмова — каб навучальная ўстанова адносілася да навучальных устаноў Беларусі, гэта значыць мела ліцэнзію РБ на аказанне адукацыйных паслуг. Калі навучанне адбывалася за мяжой ці ў філіялах нейкіх замежных устаноў у Беларусі, то вылікі не прадастаўляюцца. І гэта павінна быць першая адукацыя — альбо першая вышэйшая, альбо сярэднеспецыяльная. Але пры гэтым не мае значэння форма адукацыі — завочная, дзённая, вячэрняя.

Для таго, каб атрымаць такі вылік, у падатковую інспекцыю неабходна прадаставіць дэкларацыю, а дакументамі, якія пацвярджаюць атрыманне выліку, будуць з'яўляцца дагавор з навучальнай установай на аказанне платных паслуг, даведка навучальнай установы аб тым, што гэта першая адукацыя. Калі размова ідзе аб адукацыі дзяцей, то, адпаведна, патрэбна копія пасведчання аб нараджэнні, аб адукацыі мужа ці жонкі — копія пасведчання аб шлюбе і плацёжныя дакументы, якія пацвярджаюць панесеныя расходы. Да нас, бывае, звяртаюцца людзі, якія згубілі квітанцыю аб аплаце. Таксама нічога страшнага тут няма: калі квітанцыя страчана, сапсавана, то чалавеку неабходна звярнуцца на прадпрыемства, у навучальную ўстанову, куды ён уносіў плату, і там яму выдадуць афіцыйнае пацвярджэнне, што за навучанне была заплачана пэўная сума. Гэты дакумент будзе служыць падставай для атрымання выліку.

— А калі чалавек узяў крэдыт, і за гэтыя грошы атрымлівае адукацыю?

— Тады пад вылік будзе падпадаць не сама сума крэдыту, а расходы, якія звязаны з пагашэннем гэтага крэдыту. У гэтым выпадку чалавеку неабходна копія крэдытнага дагавора. Адзінае, што не вылічваецца з даходу, — гэта працэнты за карыстанне крэдытам.

— Яшчэ адна катэгорыя, якая можа разлічваць на льготы, — тыя грамадзяне, якія будуюць, ці купляюць жыллё?

— Гэта, мабыць, самая шматлікая катэгорыя фізічных асоб, якія атрымліваюць у нас вылікі па дэкларацыях — людзі, што знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і на працягу года нясуць расходы, якія звязаны з набыццём, будаўніцтвам жылля або аплатай крэдытаў, выкарыстаных на гэтыя мэты. На што тут хацелася б звярнуць увагу. Падкрэслю, што фізічныя асобы павінны не проста мець патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а абавязкова стаяць на ўліку альбо ў выканкамах, альбо па месцы працы. Галоўнае, каб падставы пастаноўкі на ўлік па месцы працы не адрозніваліся ад устаноўленых заканадаўствам. У нас ёсць Указ Прэзідэнта, які ўстанаўлівае ўмовы прызнання грамадзян маючымі патрэбу, і калі калектыўным дагаворам на прадпрыемстве ўмовы гэтыя зменены, і чалавек стаіць па гэтых зменаных умовах на ўліку маючых патрэбу, то, на жаль, права на вылік ён не мае. Каб было зразумела, прывяду самы распаўсюджаны прыклад. Маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў прызнаюцца тыя фізічныя асобы ў адпаведнасці з заканадаўствам, у якіх агульная плошча менш за 15 кв. м на чалавека. Калектыўным дагаворам можа быць прынята рашэнне, што маючымі патрэбу на прадпрыемстве будуць прызнавацца тыя работнікі, у каго, напрыклад, менш за 20 кв. м. Адпаведна, калі ў чалавека больш за 15 кв. м, але менш чым 20, і ён на прадпрыемстве стаіць на ўліку маючых патрэбу, права на вылік ён мець не будзе. Акрамя таго, што неабходна стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, трэба сабраць дакументы, якія пацвярджаюць панесеныя расходы. Калі чалавек набывае кватэру, то гэта будзе дагавор куплі-продажу і копія тэхпашпарта на набытую кватэру. Калі кватэра будуецца, то гэта будзе дагавор аб долевым будаўніцтве, або дакумент аб уключэнні фізічнай асобы ў ЖБК, або іншыя кааператывы і дакументы аб аплаце. Неабходна абавязкова даведка аб каштарысным кошце будаўніцтва, таму што вылік прадастаўляецца толькі ў межах каштарыснага кошту.

У маёмасным выліку ёсць вельмі цікавая асаблівасць, якая парадуе плацельшчыкаў: калі на працягу 2006 года атрыманых даходаў не хапае на тое, каб атрымаць вылік поўнасцю, то астатак выліку будзе перанесены на 2007 год, а пры неабходнасці і на 2008-ы. Напрыклад, калі чалавек купіў кватэру, патраціўшы на гэта 30 мільёнаў рублёў, а яго даход за год склаў толькі 10 мільёнаў, яму будзе прадастаўлены вылік у поўным памеры, і яго абкладаемы даход за 2006 год будзе прызнаны роўным нулю, гэта значыць падаткаў не будзе. У яго застаецца яшчэ 20 мільёнаў нявыкарыстанага выліку, якімі ён можа скарыстацца ў 2007 годзе, а калі ў яго зарплата застанецца такая ж, то і ў 2008-м.

Тыя людзі, якія маюць права атрымаць ільготы і вылікі, не абавязкова павінны зрабіць гэта да 1 сакавіка 2007 года. Фізічныя асобы маюць права скарыстацца сваімі льготамі і прадастаўленымі вылікамі на працягу 3 гадоў з моманту выплаты падатку. Калі мы гаворым аб даходах за 2006 год, то фізічныя асобы, якія за гэты год збіраюцца скарыстацца льготамі, могуць падаць дэкларацыю да 31 снежня 2009 года. Калі хтосьці толькі зараз пачуў аб гэтых вылікаў, а навучаў дзяцей у 2004, 2005 гадах, то ён таксама можа сабраць зараз усе дакументы, пайсці ў падатковую інспекцыю і да Новага года атрымаць падарунак ад дзяржавы ў выглядзе вернутых падаткаў.

— Дзе можна атрымаць гэтыя грошы?

— Як пажадае чалавек. У яго ёсць шмат спосабаў, якія ён можа выбраць. Ніхто не можа навязваць грамадзяніну нейкі пэўны спосаб вяртання грошай — гэта толькі яго выбар. А пачаць трэба з падачы дэкларацыі: пакуль яна не пададзена, ніхто не можа вызначыць суму, якая належыць вяртанню. Калі падатковы орган вызначае на падставе дэкларацыі суму, што належыць вяртанню, чалавек атрымае бясплатны бланк заявы, дзе зможа выбраць спосаб атрымання грошай.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

СПК «Староюрковичский» объявляет тендер на строительство объекта «Реконструкция с расширением МТФ на 600 голов» в д. Заполье Любанского района.

Тендерные предложения принимаются ***в течение 15 дней со дня опубликования объявления по адресу: 223842 Минская область, Любанский район, СПК «Староюрковичский».***

Справки по тел.: (8-01794) 37-6-32, 37-6-31.

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» ПРОВОДИТ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ

Извещение о проведении повторных торгов на 28 открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 28 декабря 2006 г.

№ п/п	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Тип помещения	Общая площадь (кв. м)	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Форма проводимого аукциона	Площадь отчуждаемого участка с учетом общей площади застройки отчуждаемого здания (га)	Находится в аренде
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
1.	Здание овощехранилища с крыльцами (инв. № 65/7) с ограждением из колючей проволоки (инв. № Д) — 21,6 м п.	в/г N 65 «Солнечный» г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 91а	отдельно стоящее	51,0	6 300 000	630 000	с условием*	0,05	—
2.	Здание контрольно-пропускного пункта с крыльцами (инв. № 65/15) с ограждением глухие ж/б панели (инв. № А) — 488 м, проезжая асфальтобетонная часть (инв. № Б) — 163 кв. м, бортовой камень бетонный (инв. № В) — 49 м	в/г № 65 «Солнечный» г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 91а	отдельно стоящее	18,0	8 000 000	800 000	с условием*	0,5	—
3.	Здание мастерской с тамбуром (инв. № 14/623)	в/г № 14 «Печи» г. Борисов, ул. Братьев Вайнрубов, 100	отдельно стоящее	4887,7	310 000 000	31 000 000	без условий	1,2564	—
4.	Здание контрольно-технического пункта, в т.ч. мастерских (инв. № 5/306) с асфальтовым мощением (инв. № 306)	в/г № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск	отдельно стоящее 2 этажа	177,0	70 500 000	7 050 000	без условий	0,0386	—
5.	Здание неотапливаемого гаража (инв. № 5/305) с асфальтовым мощением (инв. № 305)	в/г № 5 «Авиагородок» г. Бобруйск	отдельно стоящее	1196,0	135 000 000	13 500 000	без условий	0,2692	—
6.	Здание военной комендатуры (бывшая гауптвахта) (инв. № 2/8) с пристройкой и навесом (инв. № 2/85), забор деревянный (инв. № 2/8-ЗД) — 169,22 м п., асфальтобетонное покрытие (инв. № 2/8-АБК)-938 кв. м, ворота металлические (2 шт.) с калиткой (инв. № 2/8-ВК)	г. Слоним, Гродненская область, пер. Водопроводный	отдельно стоящее	387,0	72 500 000	7 250 000	с условием*	0,2132	—
7.	Здание гаража (инв. № 91), здание склада (инв. № 92), здание склада ГСМ (инв. № 93), здание конторы (инв. № 94), здание заправочной ГСМ (инв. № 96) с кабельной линией электропередач ААБ-1 3х120, инв. № 108, асфальтобетонное покрытие (инв. № 109), цементно-бетонное покрытие (инв. № 110, ограждение из колючей проволоки (инв. № 111), ворота металлические (инв. № 112)	в/г № 78, г. Витебск, ул. 1-я Заречная, 2Б	отдельно стоящее	795,4	200 000 000	20 000 000	без условий	1,1886	—
8.	Здание штаба с крыльцом (инв. № 65/4), здание уборной (инв. № 65/4а), ограждение дощатое (инв. № Ф), ограждение глухие ж/б панели (инв. № Х), ограждение кирпичное (инв. № Ш), ворота металлические (инв. № Щ)	в/г № 65 «Солнечный» г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 91а	отдельно стоящее	233,0	112 100 000	11 210 000	с условием*	0,4	—

* Профиль использования здания овощехранилища с крыльцами (инв. № 65/7), здания контрольно-пропускного пункта с крыльцами (инв. № 65/15), здание штаба с крыльцом (инв. № 65/4) определяется нахождением их в коммунальной зоне. Использование этих зданий под производственную базу, склад или размещение производства возможно при условии согласования с заинтересованными службами (санитарно-эпидемиологической, пожарной, экологической и т.п.).

Окончательное решение об отводе земли принимается местными органами власти.

28-й аукцион состоится в 11.00 28 декабря 2006 г. по адресу: г. Минск. ул. Казинца, 4, концерн «Белресурсы».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 26 декабря 2006 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 618 РУП «Белспецконтракт».

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи в день проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости объекта платежами в течение 20 календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

По ранее проведенным торгам извещение публиковалось в газетах: «Рэспубліка» 22 ноября 2003 г., 10 апреля 2004 г., 4 июня 2005 г., 22 октября 2005 г., 29 апреля 2006 г., 27 мая 2006 г., 30 июня 2006 г., «Из рук в руки» г. Гомель от 1 ноября 2006 г., «Вечерний Гомель» г. Гомель от 07.12.2006 г., «Звязда» 9 сентября 2006 г., 23 сентября 2006 г., 7 октября 2006 г., 13 октября 2006 г., 18 октября 2006 г., 16 ноября 2006 г., 05 декабря 2006 г.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1 код 357, УНП 101099370. Без НДС.

Справки по тел./факсу (017) 224-88-05. Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com e-mail: info@belspeckontrakt.com

УЛАДА — У ІНТАРЭСАХ НАРОДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Давер народа да ўлады прадугледжвае прафесіянальную і дакладную работу дзяржаўнага апарату ў цэнтры і рэгіёнах, адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

На яго думку, важным з'яўляецца стварэнне іміджу дзяржаўных структур як дзелавых партнёраў чалавека. Зусім недапушчальна, калі чалавек часам траціць тыдні і месяцы на пустыя хаджэнні па інстанцыях, каб вырашыць элементарныя пытанні. Перш за ўсё неабходна арганізаваць эфектыўную работу ўстаноў і арганізацый, непасрэдна звязаных з абслугоўваннем насельніцтва, па прынцыпу «аднаго акна».

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта перакананы, што ў выніку структурных змяненняў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання больш эфектыўна будуць вырашацца пастаўленыя на гэтую пяцігодку задачы, павышацца розультатыўнасць кіраўніцкай дзейнасці.

На якасна новым узроўні вызначаны канцэптуальныя асновы ўдасканалення работы органаў улады і кіравання. У выніку нововўвядзенняў забяспечваецца плаўны пераход ад кіравання дзяржавай, дзе пераважаюць камандна-адміністрацыйныя метады, да эканамічнага рэгулявання. А самае галоўнае — дасягаецца дакладная кіруемасць і скаардынаванасць ва ўсіх узаемазвязаных галінах, матэрыяльныя, тэхнічныя і кадравыя рэсурсы канцэнтруюцца на вырашэнні прыярытэтных задач.

Новая структура ўрада сфармавана на прынцыпах пераемнасці і ўдасканалення ранейшай структуры. Цяпер утворана 25 міністэрстваў, 7 дзяржаўных камітэтаў (было 6). Пры гэтым ліквідаваны ўсе 8 камітэтаў пры Савеце Міністраў — 2 рэарганізаваны ў дзяржаўныя камітэты, 5 пераўтвораны ў дэпартаменты міністэрстваў і дзяржкамітэтаў. Замест Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў створаны спецыяльны дзяржаўны орган — Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Замест 8 арганізацый, падпарадкаваных ураду (6 канцэрнаў, Белкаапсаюз і Беларуская чыгунка) захавана толькі 5 (4 канцэрны і Белкаапсаюз). Канцэрны, якія ўваходзяць у склад міністэрстваў і выконваюць толькі гаспадарчыя функцыі, пераўтворацы ў вытворчыя аб'яднанні. З існуючых раней 47 рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ўтворана 37.

Новая схема кіравання значна спрасціла вырашэнне многіх пытанняў. У прыватнасці, працэдуру афармлення адвядзення зямлі і маёмасных правоў. Цяпер вырашэнне ўсіх гэтых пытанняў засяроджана ў адным органе — Дзяржаўным камітэце па маёмасных адносінах і зямельных рэсурсах. Ён створаны на базе некалькіх структур — Камзема, фонду маёмасці Мінэканомікі. Фактычна цяпер неабходную даведку можна атрымаць у два-тры разы хутчэй. Скарочана і колькасць чыноўнікаў, якія задзейнічаны ў гэтай працэдуры.

Замест трох дзяржаўных структур, якія ажыццяўляюць функцыі стандартызацыі, сертыфікацыі, тэхнічнага нагляду і кантролю (Дзяржстандарт, Дзяржбуднагляд Мінбудархітэктуры, Камэнергаэфектыўнасці) створаны адзіны незалежны спецыялізаваны Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі, метралогіі і нагляду ў будаўніцтве і энергетыцы, якому прадастаўлены вялікія правы.

Аляксандр Папкоў звярнуў увагу на рэарганізацыю і некаторых іншых важных структур. У прыватнасці, больш адказныя і складаныя функцыі ўскладзены на Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства транспарту і камунікацый, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі. Гэты блок пытанняў непасрэдна закранае інтарэсы ўсяго насельніцтва краіны і ад эфектыўнай сістэмы кіравання ім у многім залежыць і стабільнасць у дзяржаве. Узважаныя, а недзе і нестандартныя рашэнні, прынятыя ў працэсе пераўтварэння, не павінны разбурыць усё напрацаванае за апошнія гады, а наадварот, якасна палепшыць аснову і наблізіць яе да дасягнутага сусветнага ўзроўню.

Усе пытанні, звязаныя з транспартным комплексам — авіяцыйным, аўтамабільным і чыгуначным, сканцэнтраваны цяпер у адным дзяржаўным органе — Міністэрстве транспарту і камунікацый. Тут створаны дэпартамент па авіяцыі (з правамі юрыдычнай асобы), у падпарадкаванне міністэрства таксама парадаздзена Беларуская чыгунка.

Асабліва істотныя змяненні адбыліся ў сістэме органаў па надзвычайных сітуацыях. Камітэты па матэрыяльных рэзервах і па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС перададзены ў склад Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, на іх базе створаны два новыя дэпартаменты. У выніку гэта сістэма становіцца больш магутнай, а значыць, больш дзейснай і эфектыўнай, ад работы якой у многім залежыць бяспека дзяржавы і народа.

Аляксандр Папкоў падкрэсліў, што ў новым, значна абноўленым складзе, працуе Міністэрства аховы здароўя, рэарганізацыя якога вялася працяглы перыяд. Цяпер яно займаецца практычна ўсім комплексам пытанняў: лячэння, рэабілітацыі, аднаўлення пасля лячэння і аздараўлення насельніцтва рэспублікі. Здароўе людзей — залог здаровага ладу жыцця ва ўсёй дзяржаве. Для больш поўнага задавальнення патрэбнасцяў сістэмы аховы здароўя ў лекавых айчынных прэпаратах канцэрн «Белбіяфарм» пераўтворацы ў вытворчае аб'яднанне і перададзены ў падпарадкаванне Міністэрства аховы здароўя. Акрамя таго, у склад гэтага міністэрства ўключаны Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню насельніцтва, што дало магчымасць забяспечыць адзіныя падыходы да лячэння, рэабілітацыі, аднаўленню пасля лячэння і аздараўлення насельніцтва рэспублікі.

Для цэнтралізацыі і вырашэння сумежных прававых і фінансавых задач Белкамархіў перададзены Мінюсту, а Камітэт па каштоўных паперах — Мінфіну, у іх структурах створаны адпаведныя дэпартаменты.

Прадпрыемствы канцэрна «Белмясцпрам» з улікам іх малаэфектыўнасці, малалікасці і разнапрофільнасці перададзены ў адпаведныя міністэрствы і ў камунальную ўласнасць абласцей. Сам канцэрн ліквідаваны.

Што датычыцца іншых нововўвядзенняў, яны таксама прыметна палепшылі механізм кіравання ў вядучых сацыяльных сферах. Размова ідзе аб аб'яднанні ў адзіныя органы Міністэрства юстыцыі і Белкамархіву, Міністэрства фінансаў і Камітэта па каштоўных паперах.

Такім чынам, у кіраванні ліквідаваны дубліруючыя звёны, адпаведна ідзе аптымізацыя дзяржаўных структур, штатаў і колькасці іх апарату. Значна ўзраслі прававыя і ўладныя паўнамоцтвы створаных у выніку рэарганізацыі рэспубліканскіх органаў кіравання.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта сказаў, што на якасна новай аснове наладжваецца ўзаемадзеянне рэспубліканскіх і мясцовых выканаўчых органаў улады. З мэтай аптымізацыі структуры, павышэння эфектыўнасці дзейнасці мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў прыняты ўказ «Аб структуры, функцыях і колькасці работнікаў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў».

У адпаведнасці з новай структурай урада лагічна ўвязана структура мясцовых органаў улады. Напрыклад, дакладна абазначана вертыкаль улады, пачынаючы ад намесніка прэм'ер-міністра, намесніка старшыні аблвыканкама і да намесніка старшыні райвыканкама, якія адказваюць за адзін блок пытанняў, толькі на розных узроўнях. У адпаведнасці з задачамі, пастаўленымі Прэзідэнтам Беларусі, умацавана сістэма кіравання будаўнічым комплексам. Дакладна абазначана таксама вертыкаль, з рэспубліканскага да раённага ўзроўню, у сацыяльнай сістэме (адукацыі, ахове здароўя, культуры, спорце).

Аптымізавана колькасць апаратаў абл- і райвыканкамаў. Калі раней штатны расклад тут быў прыкладны, то цяпер ён стаў тыпавы. Канкрэтна вызначаны абавязкі ўсіх службовых асоб.

На думку Аляксандра Папкова, усе нововўвядзенні накіраваны на павышэнне кіруемасці і скаардынаванасці ў дзейнасці ўзаемазвязаных галін і сфер. Новая структура ўрада, найбольш аптымальная ў цяперашніх умовах, прызначана вырашаць маштабныя задачы, пастаўленыя на гэтую пяцігодку.

Цяпер вядзецца вялікая работа па ўдасканаленню пярвічнага звяна ўлады — мясцовага кіравання і самакіравання. На чарзе — істотныя перамены ў структуры сельскіх, пасялковых выканаўчых камітэтаў.

Усе змяненні, якія адбыліся ў гэтым годзе, закладваюць аснову для эфектыўнай дзейнасці ўрада па прыцягненню нявыкарыстаных рэзерваў і дасягненню максімальнай эканамічнай выгады на карысць народа.

Аліна ГРЫШКЕВІЧ, БЕЛТА.

ГАРАНТЫІ. ЗА КОШТ СТАЛІЧНАГА БЮДЖЭТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Каб падтрымаць сем'і, у якіх з'явілася дзіця, прынамсі ў першы, самы складаны перыяд, для бацькоў-мінчан уведзена дадатковая даплата па догляду дзіцяці ва ўзросце да 1 года, — распавядае Наталля Расолька. — Памер такой даплаты складае розніцу паміж бюджэтам пражытачнага мінімуму і «стандартнай» дзяржаўнай дапамогай, або зараз — 55 550 рублёў. Дарэчы, само права на даплату ўзнікае з дня прызначэння дзяржаўнай дапамогі на дзіця да 3 гадоў, а для атрымання «гарадской» падтрымкі неабходна прадставіць у раённы цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва пэўны пакет дакументаў — заяву аднаго з бацькоў, пасведчанні аб нараджэнні дзіцяці і аб рэгістрацыі шлюбу, даведку аб тэрмінах прызначэння дзяржаўнай дапамогі і аб складзе сям'і (прычым, калі бацькі прапісаны па розных адрасах, то даведку з месца жыхарства трэба ўзяць кожнаму з іх), а жанчыны, што нарадзілі па-за шлюбам, павінны таксама прынесці даведку аб нараджэнні дзіця па форме, вызначанай Міністэрствам юстыцыі. Нарэшце, для атрымання сталічнай даплаты бацькі мусяць адкрыць рахунак у адным з філіялаў ААБ «Беларусбанк». Грошы будуць пералічвацца менавіта на гэты рахунак у безнаяўным парадку, што, з улікам адданенасці тэрытарыяльных цэнтраў ад некаторых раёнаў сталіцы, нашмат больш зручна.

Зрэшты, даплата на дзяцей да 1 года — пункт далёка не адзіны. Апроч таго, гарадской праграмай прадугледжана аднаразовая дапамога сем'ям пры нараджэнні другога дзіцяці ў памеры бюджэту пражытачнага мінімуму (да прыкладу, зараз — 165 790 рублёў), аднаразовыя выплаты ў памеры БПМ сем'ям з дзецьмі, якія не могуць прэтэндаваць на адрасную сацыяльную дапамогу, але пры гэтым маюць даходы ніжэй бюджэту пражытачнага мінімуму, асобам, што вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі, і былым выпускнікам дамоў-інтэрнатаў ва ўзросце да 23 гадоў, а таксама штомесячная дапамога непрацуючым асобам, якія даглядаюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, у памеры мінімальнай пенсіі па ўзросту (сёння — 42 400 рублёў).

Асобная гаворка аб кампенсацыі кошту жыллёва-камунальных паслуг. Згодна з гарадской праграмай, прыёмныя сем'і ў сталіцы тут могуць разлічваць на дапамогу ў памеры да 2 базавых велічынь (62 тысячы), сем'і, якія выхоўваюць 4 дзяцей, — у памеры да 25 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму (41 450 руб.), а сем'і, што налічваюць 5 і больш дзяцей, — у памеры 50 працэнтаў БПМ (82 900 рублёў) штомесяц.

Далей. Нялішне нагадаць, што ў той жа праграме на наступны год «закладзена» магчымасць аказання аднаразовай дапамогі да навучальнага года ў памеры 30 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму на кожнае дзіця ў шматдзетнай сям'і (за выключэннем выпадкаў выхавання ў дзяржаўных установах), магчымасць кампенсацыі ў памеры да 60 працэнтаў базавай велічыні кошту навучання дзяцей са шматдзетных сем'яў у музычных школах — пры ўмове, што тут навучаецца не менш чым два дзіцяці або сама сям'я налічвае не менш за 4 дзяцей, а таксама магчымасць выдачы жанчынам, якія ўзнагароджаны ордэнам Маці і працягваюць выхоўваць непаўналетніх дзяцей, бясплатнага праязнога білета на карыстанне гарадскім грамадскім транспартам.

Нарэшце, трэба мець на ўвазе, што апроч матэрыяльных «ільгот», для тых жа шматдзетных сем'яў у Мінску вызначаны і іншыя перавагі. Да прыкладу, гаворка ідзе аб праве бясплатнага карыстання паслугамі дзяржаўных натарыусаў і работнікаў ЗАГСаў да Дня Канстытуцыі, Міжнароднага дня абароны дзяцей, Дня маці і Дня юрыста і праве на бясплатныя кансультацыі адвакатаў сталіцы паводле спецыяльных графікаў.

«Прыбаўка» для дзвюх груп

Статыстыка сведчыць, што зараз ў сталіцы пражывае звыш 105 тысяч інвалідаў. І, паводле слоў Наталлі Расолька, абысці іх увагай нельга. У прыватнасці, у 2007 годзе гарадскі бюджэт мае намер зноў прафінансаваць аплату пропускаў ці абанементаў на паслугі інвалідаў-калясачнікаў у лячэбна-рэабілітацыйным комплексе Беларускага пратэзна-артапедычнага аднаўленчага цэнтра.

— Аднак, на наш погляд, нашмат больш адметны наступны нюанс, — адзначае Наталля Расолька. — Паводле гарадской праграмы, усе непрацуючыя інваліды Мінска I і II груп, у якіх памер сацыяльнай пенсіі па інваліднасці не дасягае бюджэту пражытачнага мінімуму, па-ранейшаму будуць атрымліваць штомесячную дапамогу ў 1 мінімальную пенсію па ўзросту. Праўда, адбудзецца гэта пры ўмове, што такія інваліды не знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні.

Паважны ўзрост. І «нялішнія» грошы

Мінск — горад адносна малады. Дастаткова сказаць, што фактычна тут назіраецца самая нізкая па краіне доля асоб у пенсійным узросце — каля 20 працэнтаў. Аднак вядома: параўнальна невысокая колькасць яшчэ не сведчыць аб адсутнасці праблем. Прынамсі, у некаторых катэгорый пенсіянераў.

— Праграма мерапрыемстваў па сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый жыхароў горада Мінска на 2007 год вызначае, што, як і зараз, да «асноўнай» дапамогі непрацуючым асобам, якія даглядаюць інвалідаў I групы ці састарэлых ва ўзросце больш за 80 гадоў, будуць працягвацца штомесячныя дадатковыя выплаты ў памеры мінімальнай пенсіі па ўзросту, якая складае на сёння 42 400 рублёў, — працягвае Наталля Расолька. — Захавана штомесячная выплата ў такім жа памеры і жыхарам сталіцы, што дасягнулі 95-гадовага ўзросту. Праўда, тут з'явіцца новая ўмова — такія жыхары не павінны знаходзіцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні. Прычым таксама адсутнасць поўнага дзяржаўнага забеспячэння будзе падставай для прызначэння яшчэ адной гарадской дапамогі ў памеры 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту непрацуючым маці (або, калі іх няма, то непрацуючым бацькам) вайскоўцаў, якія загінулі ці прапалі без вестак пры выкананні службы.

Адначасова жыхары сталіцы, якія знаходзяцца на надомным абслугоўванні і цалкам страцілі рухомую актыўнасць, змогуць раз у месяц скарыстацца бясплатным мыццём 10 кілаграмаў бялізны і раз у два месяцы — бясплатнымі паслугамі цырульніка. А непрацуючым інвалідам I ці II груп са жніўеньскай пенсіяй ніжэй адзнакі бюджэту пражытачнага мінімуму, асобам са жніўеньскай пенсіяй менш за БПМ, якія знаходзяцца на надомным абслугоўванні, а таксама дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў плануецца аказаць аднаразовую грашовую дапамогу ў памеры 30 працэнтаў зноў-такі бюджэту пражытачнага мінімуму на сезоннае набыццё агародніны.

І ўсё ж асаблівая ўвага — ветэранам вайнаў. Так, нагадвае Наталля Расолька, у сталіцы ўжо стала практыкай прызначэнне інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, якія не знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, штомесячнай дадатковай дапамогі на ўзроўні мінімальнай пенсіі па ўзросту. А членам сем'яў ваеннаслужачых, партызан і падпольшчыкаў, што загінулі ці памерлі ў гады Вялікай Айчыннай, — у памеры 50 працэнтаў гэтай сумы.

Плюс да таго, гарадская праграма вызначае магчымасць аказання сем'ям аднаразовай дапамогі ў 150 тысяч рублёў на набыццё кветак для наведвання месцаў пахавання загінулых пры выкананні службы ў Афганістане ці іншых краінах баявых дзеянняў вайскоўцаў, а таксама прадастаўленне падтрымкі для рамонту помнікаў гэтым людзям.

Падтрымку вызначаюць рэгіёны

Варта падкрэсліць адразу: усе пералічаныя вышэй дадатковыя гарантыі фінансуюцца з бюджэту сталіцы. І, адпаведна, права на іх маюць толькі мінчане. Аднак якраз тут могуць узнікнуць некаторыя «пікантныя» сітуацыі. Скажам, жонка пражывае ў Мінску, а муж — у Барысаве. Ці можа такая сям'я прэтэндаваць, да прыкладу, на даплату дзіцяці ва ўзросце да года?

— У такіх варунках усё залежыць ад таго, дзе прапісана непасрэдна дзіця, — тлумачыць Наталля Расолька. — Бо калі месцам яго прапіскі будзе Мінск, ніякіх перашкод для атрымання даплаты быць не можа. А вось калі Барысаў, то разлічваць на дапамогу ўжо не выпадае. Прынамсі, на дапамогу за кошт бюджэту сталіцы, бо, як вядома, тыя ці іншыя дадатковыя меры падтрымкі кожны рэгіён Беларусі можа вызначаць самастойна.

І яшчэ. Паводле слоў Наталлі Расолька, як правіла, «гарадскія» даплаты і льготы прадастаўляюцца праз тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства. Тут канчаткова вызначаць правы кожнага канкрэтнага чалавека, а таксама — дадуць поўную інфармацыю наконт збору неабходных дакументаў. Пры гэтым у Заводскім раёне такі цэнтр знаходзіцца па адрасу: Партызанскі праспект, 52, у Ленінскім — вул. Дзянісаўская, 2 і вул. Маякоўскага, 18, у Маскоўскім — вул. Алібегава, 25, Кастрычніцкім — вул. Ляўкова, 19, Партызанскім — зав. Клумава, 3-А, Першамайскім —вул. Валгаградская, 21-А, Савецкім — вул. Гікалы, 22, Фрунзенскім — вул. Адзінцова, 85, а ў Цэнтральным — на вуліцы Чырвонай, 3.

Сяргей ГРЫБ.

«Сем цудаў Беларусі»

«Кніжныя Каляды» — незвычайная імпрэза пад такой назвай адбылася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Супрацоўнікі бібліятэкі разам са студэнтамі і выкладчыкамі, сярод якіх знаныя майстры беларускай сцэны Рыма Маленчанка і Тамара Нікалаева, задумалі зрабіць свайм калегам па ўстанове Каляды падарунак.

Яны падарылі ўсім зацікаўленым сустрэчу з беларускай кнігай. Кнігай, народжанай у серыі «Сем цудаў Беларусі», што прысвечана нашай багатай і слаўнай гісторыі і яе стваральнікам. Распачало серыю мінскае выдавецтва «Кавалер», а зараз годна працягвае Мінская фабрыка каляровага друку. Аўтар кніг — пісьменнік Анатоль Бутэвіч. А ягоны мастацкі сааўтар — малады і таленавіты мастак Павел Татарнікаў. Нават у саміх назвах кніг чуецца водгулле далёкіх падзей: «У гасцях у вечнасці», «Званы Нямігі», «За наміткай гісторыі», «Адвечны покліч Радзімы»...

Выйшла пяць кніг Анатоля Бутэвіча. Апошняя з іх — «Славутыя родам сваім» прысвечана тым, хто неклі сваім вайсковым, мастацкім, навуковым, арганізатарскім талентам праславі ў нашу зямлю. Соф'я Гальшанская, Соф'я і Анастасія Слуцкія, Канстанцін Астрожскі, прадстаўнікі роду Храптовічаў, Хадкевічаў, Чартарыйскіх, Гаштольдаў сталі героямі гэтай кнігі.

Пра «герояў» жа іншых кніг — Смаргонскую мядзведжую акадэмію, Мінскі абраз Божай маці, летапіснае Бярэсце, Камянецкую Белую вежу, Мірскі, Крэўскі і Нясвіжскі замкі, Каложскую царкву, пра Мір як «цыганскую сталіцу на ўсё Вялікае княства Літоўскае» і шмат што іншае таксама вялася гаворка на сустрэчы з аўтарам кніг і мастаком. А студэнты нават паспрабавалі ўвасобіць сёе-тое ў спецыяльна разыграныя сцэнкі.

Як зазначыла рэктар універсітэта Ядвіга Грыгаровіч, гэтая імпрэза пашырыла абсяг традыцыйнага ўніверсітэцкага свята мастацтваў «Калядная зорка», якое даўно ладзяць студэнты і выкладчыкі, стала цікавай новай старонкай, якая з часам таксама можа стаць традыцыйнай.

Імпрэзу годна дапоўніла выстава ілюстрацый Паўла Татарнікава, якая працягне сваё жыццё ў сценах бібліятэкі некалькі тыдняў, і выстава кніг Анатоля Бутэвіча.

Адбываліся кніжныя Каляды пад поклічным і інтрыгуючым дэвізам «У гасцях у вечнасці». І ніхто з прысутных не пашкадаваў, што прыняў гэтую прапанову і хоць на хвілінку зазірнуў за намітку гісторыі, якая ахвотна адкрывае свае таямніцы настойлівым шукальнікам і даследчыкам.

А ў якасці рэальнага Каляднага падарунка засталіся кнігі з аўтографам аўтара і мастака. Застаецца і чаканне новых сустрэч з серыяй кніг «Сем цудаў Беларусі».

Міхась АЛІМПІК.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

о проведении открытой подписки на акции дополнительного выпуска открытого акционерного общества «Дабрабыт»

1. Адкрытае акцыянернае таварыства «Дабрабыт», сокращенное — ААТ «Дабрабыт»
Открытое акционерное общество «Дабрабыт», сокращенное — ОАО «Дабрабыт»
Зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета № 401 от 30.06.2000 г. в Едином государственном реестре за № 600031478.
Юридический адрес: г. Несвиж, ул. Советская, 10а.
Почтовый адрес: 222603 Минская обл., г. Несвиж, ул. Советская, 10а.
Тел./факс (8-01770) 5 56 67.
2. Основные виды деятельности:
- 74810 — деятельность в области фотографии;
- 93040 — физкультурно-оздоровительная деятельность;
- 93020 — услуги парикмахерских и прочие услуги салонов красоты;
- 18210 — производство спецодежды;
- 28759 — производство прочих металлических изделий, не включенных в другие группировки;
- 50200 — техническое обслуживание и ремонт автомобилей;
- 514 — оптовая торговля непродовольственными товарами потребительского назначения;
- 524 — прочая розничная торговля в специализированных магазинах;
- 5262 — розничная торговля в палатках и на рынках;
- 52630 — прочая розничная торговля вне магазинов;
- 50622 — розничная торговля на рынках;
- 51709 — неспециализированная оптовая торговля непродовольственными товарами;
- 51390 — неспециализированная оптовая торговля пищевыми продуктами, включая напитки, и табачными изделиями;
- 44 — розничная торговля (включая алкогольные напитки и табачные изделия) и общественное питание;
- 26611 — производство сборных железобетонных и бетонных конструкций и изделий;
- 361 — производство мебели;
- 20400 — производство деревянной тары;
- 20512 — производство прочих изделий из дерева;
- 203 — производство строительных конструкций и столярных изделий;
- 52744 — ремонт и реставрация бытовой мебели;
- 5271 — ремонт обуви и прочих изделий из кожи;
- 5274 — ремонт бытовых изделий и предметов личного пользования, не включенных в другие группировки;
- 17600 — производство трикотажного полотна;
- 52741 — ремонт и переделка трикотажных и вязаных изделий;
- 17720 — производство готовой трикотажной одежды машинной и ручной вязки;
- 182 — производство одежды из текстильных материалов;
- 17400 — производство готовых текстильных изделий, кроме одежды;
- 52741 — ремонт и переделка трикотажных и вязаных изделий;
- 52742 — ремонт и переделка швейных изделий, головных уборов и изделий текстильной галантереи;
- 18303 — производство изделий из натурального и искусственного меха;
- 5272 — ремонт электробытовых приборов;
- 52743 — ремонт меховых изделий;
- 60240 — деятельность автомобильного грузового транспорта;
- 37 — перевозка пассажиров и грузов (исключая технологические внутрихозяйственные перевозки пассажиров и грузов, выполняемые юридическими лицами и индивидуальными предпринимателями для собственных нужд) автомобильным, внутренним водным, морским транспортом;
- 63214 — услуги по хранению транспортных средств, принадлежащих гражданам;
- 71400 — прокат бытовых товаров и предметов личного пользования, не включенные в другие группировки;
- 93030 — организация похорон и предоставление связанных с ними услуг;
- 70200 — сдача в наем собственного недвижимого имущества;
- 92720 — прочая деятельность по организации отдыха и развлечений, не включенных в другие группировки;
- 93011 — стирка и обработка белья и других изделий;
- 93012 — химчистка и окрашивание.

Общество создано без ограничения срока.

3.Основные показатели финансово-хозяйственной деятельности эмитента:

Основные показатели	Единица измерения	01.01. 2006 г.	01.10. 2006 г.
1. Чистые активы	млн. руб.	459	368
2. Обеспеченность акции имуществом Общества		0,63	0,51
3. Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (в соответствии с бухгалтерским балансом)	млн. руб.	170	132
4. Себестоимость реализованной продукции	млн. руб.	207	157
5. Балансовая прибыль	млн. руб.	-37	-25
6. Чистая прибыль	млн. руб.	-	-24
7. Рентабельность	%	-24,6	-16
8. Просроченная дебиторская задолженность	млн. руб.	-	-
9. Просроченная кредиторская задолженность	млн. руб.	44	47
10. Сумма, направленная на выплату дивидендов	млн. руб.	-	-
11. Коэффициент текущей ликвидности		0,55	0,51
12. Коэффициент обеспеченности собственными оборотными средствами		-0,81	-0,97
13. Среднесписочная численность работников	человек	55	43
14. Количество акционеров	человек	60	60

4. Уставный фонд зарегистрирован в размере 458999442 белорусских рублей, разделен на 723 простые именные акции.

5. Размер объявленного уставного фонда составляет 530737944 рубля.

Планируемый объем дополнительной эмиссии акций 71738502 рубля. Открытой подписке предлагается 113 (сто тринадцать) акций, из них простые именные в количестве 113 акций. Номинальная стоимость акции составляет 634854 рубля. Цена подписки на акции дополнительного выпуска равна 634854 рубля.

6. Дивиденды могут выплачиваться как по итогам года (годовые), так и промежуточные (ежеквартальные, полугодовые). Период, за который выплачиваются дивиденды, а также период, в течение которого Общество осуществляет их выплату, устанавливает собрание.

Размер дивидендов объявляется в рублях на одну акцию. Дивиденды выплачиваются деньгами, а по решению собрания и с согласия их получателей — товаром, ценными бумагами или иным имуществом.

Информация о времени и месте выплаты дивидендов доводится до сведения акционеров в том же порядке, в котором они извещаются о проведении собрания. По заявлению акционера, причитающиеся ему дивиденды высылаются почтовым переводом или перечисляются на его счет в учреждении банка.

7. Место проведения подписки г. Несвиж Минской области.

Время проведения — с 8.00 по 17.00 по будним дням.

Срок проведения подписки — 10 дней со дня, следующего за днем опубликования краткой информации.

Цель проведения открытой подписки — формирование доли Несвижского районного исполнительного комитета в уставном фонде Общества.

Направление использования средств — неденежный вклад подлежит использованию в производственной деятельности Общества.

Передача недвижимого имущества, вносимого в качестве неденежного вклада в уставный фонд Общества, осуществляется после заключения договора подписки в течение трех дней в месте расположения указанного имущества.

Подписка прекращается досрочно при полном формировании объявленного уставного фонда.

При недостижении или превышении объявленного уставного фонда фактические результаты подписки утверждаются собранием.

Условия отказа от заключения договора: отказ в подписке на акции дополнительного выпуска может быть вызван нарушением условий подписки, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь.

Условия и порядок возврата средств инвесторам при отказе от выпуска акций (запрете проведения открытой подписки): денежные средства (имущество), полученные путем открытой подписки, возвращаются лицам, его передавшим, в месячный срок со дня принятия такого решения.

8. Номера расчетного и валютных счетов и наименование обслуживающего банка: р/с 3012201760015 в ф-ле 620 АСБ «Беларусбанк» (г. Несвиж), код 523

валютный счет 3012201760044 в ф-ле 620 АСБ «Беларусбанк» (г. Несвиж), код 523

валютный счет 3012201760057 в ф-ле 620 АСБ «Беларусбанк» (г. Несвиж), код 523.

9. С более подробной информацией (проспектом эмиссии) можно ознакомиться по адресу: г. Несвиж, ул. Советская, 10 по рабочим дням с 8.00 до 17.00, перерыв — с 13.00 до 14.00.

И.о. директора И.Е. Юревич. **Гл. бухгалтер Н.В. Шевчук.**

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Цяльцам не варта разлічваць на абяцанні, а для Скарпіёнаў самы час наведаць рэстаран...

АВЕН. Вашы планы і задумы рэалізуюцца толькі ў тым выпадку, калі знойдзеце ў сабе сілы дзейнічаць незаўважна, не расказваючы ўсё, што можна і што нельга, навакольным. На гэтым тыдні пажадана выправіць свае памылкі. Звярніце ўвагу на адносіны з партнёрамі: магчыма, не ўсе з іх добрасумленныя ў выкананні пагадненняў. У панядзелак і аўторак пастарайцеся не прымаць паспешлівых рашэнняў, бо сітуацыя можа выйсці з-пад кантролю. У другую палову тыдня надзяліце сям'і і дому больш часу і ўвагі. Пастарайцеся ўзбагаціць сябе ўражаннямі, выбіраючыся за горад на свежае паветра.

ЦЯЛЕЦ. Панядзелак абяцае быць удалым для зносінаў з роднымі: нават уладальнікі самага складана характару пакажуць сябе з лепшага боку. Калі аўторак не будзе вельмі загружаны работай, лепш правесці яго ў кампаніі сяброў. На абяцанні, якія вы атрымаеце ў суботу, асабліва разлічваць не варта. Нядзеля — цудоўны дзень для правядзення навуковых даследаванняў і эксперыментаў.

БЛІЗНЯТЫ. Эгацэнтрызм — не ваш стыль. Вы, зразумела, абаяльныя і вартыя пахвалы, але не варта займацца выключна самалюбаваннем. Агледзьцеся: раптам камусьці з вашага акружэння патрэбна дапамога? У панядзелак не варта займацца выхаваннем навакольных, калі не хочаце трапіць пад град эмоцый. Не зацягвайце з вырашэннем праблем у сераду: нават дробязь, адкладзеная на заўтра, можа стаць непад'ёмным грузам з цягам часу.

РАК. Поспех абавязкова прыйдзе, але вам неабходна прыкласці некаторыя намаганні. Для пачатку — сабрацца. Пажадана накіраваць сваю энергію ў патрэбнае рэчышча, а не расходаваць яе па дробязях. Ваша добрасумленная праца дасць станоўчыя вынікі, а ініцыятыва не застанецца незаўважанай. У аўторак вырашацца некаторыя праблемы, якія даўно непакоілі. Будзьце больш асцярожнымі ў суботу: вы можаце лёгка паддацца бязглуздым ідэям і трапіць у авантурную гісторыю. Нядзеля, хутчэй за ўсё, стане яркім і актыўным днём. Пастарайцеся максімальна выкарыстоўваць магчымасці і ажыццявіць планы, якія яшчэ не рэалізаваныя.

ЛЕЎ. Тыдзень дазволіць парадавацца поспехам блізкіх людзей. Неабходна будзе асведамляць падзеі, якія адбываюцца. Абапірайцеся на прынцыпы і перакананні, якія пераважаць сумніўную імгненную выгаду. У панядзелак непажадана канфліктаваць з навакольнымі з-за дробязяў. У аўторак будзьце больш уважлівымі — не прапусціце цікавую інфармацыю. У сераду лепш не прадпрымаць нічога новага і сур'ёзнага. У чацвер будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі. У суботу будзьце больш асцярожнымі, бо вас можа падпільноўваць падман ці расчараванне. Лепш правесці гэты дзень у адасабленні.

ДЗЕВА. Не адчуваеце, што жыццё стала спакайнейшым? Гібка лавіруючы паміж людзьмі і сітуацыямі, вы зможаце многага дасягнуць. Асцерагайцеся спакусаў, якія могуць звесці вас з правільнага шляху. У чацвер давядзецца разбірацца адразу з некалькімі неадкладнымі праблемамі, а ў суботу — аргументавана адстойваць свае погляды. Памятайце, што разумны кампраміс ніколі не зашкодзіў.

ШАЛІ. Ваша неперайздыценае самавалоданне і несумненнае лідарства дазволяць вам без асаблівых намаганняў кіраваць людзьмі. На гэтым тыдні вы з галавой акуняцеся ў работу, разбіраючыся са справамі, якіх назапасілася. Не правакуйце сваімі дзеяннямі і выказваннямі незадаволенасць навакольных. Давядзецца адказваць за свае памылкі. Асцерагайцеся рыць каму-небудзь яму — яна гарантавана будзе вашай. Не займайцеся самападманам: прыхарошваць рэчаіснасць наогул не варта. Магчымы напружаныя паездкі і сустрэчы. У панядзелак лепш не разлічваць на дапамогу сяброў. Аўторак спрыяльны для новых пачынанняў і прадстаўленне начальству сваіх планаў і праектаў. У суботу ўдалыя паездкі і камандзіроўкі, магчымы перспектыўныя прапановы. У нядзелю займіцеся сабой і не бярыце пад увагу бытавыя праблемы.

СКАРПІЁН. Стварыце сабе трывалы і надзейны фундамент для спрыяльных умоў працы і творчасці. Акунанне ў работу павінна быць камфортным і не прыносіць душэўных узрушэнняў. Калі штосьці не ўдаецца гэтак жа добра, як звычайна, — не перажывайце: хутка вы зможаце адпачнуць. Да пятніцы скончацца цяжкасці і перажыванні, а вы адчуеце асалоду ад добра выкананай працы і яе прыемных наступстваў. Субота — цудоўны дзень для наведвання рэстарана — тым больш, калі вас туды даўно запрашалі сябры ці каханы чалавек.

СТРАЛЕЦ. Не мае сэнсу супраціўляцца абставінам і спрабаваць штосьці змяніць. Настаў момант, калі лепш плыць па цячэнню, —

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.





Фота 3 | Фота 1 | Біяполе | Дугападобнае пярыццё | Дробная водная расліна | Манга-ліодная ... | Адзін круг танца | Вялікае парусное судна | Жорсткі мучы-цель | Умоўнае абазначэнне | Вялікі гармонік | Вядомы шведскі ВІА | Маскоўскі князь | Вага тавару з тарай | Іканапісец | Маладая авечка | Фота 4 | Самка паўліна | Жыллё індзей-цаў | Нахіл судна | Спявачка, фота 5 | Трэцяя ступень ліку | Гучны выкрык | Помнік даўніны ў Гродне | Урачыстая харавая песня | Белы клён | Борт судна | Японскае піва | Рашэнне, прыняцце галасаваннем | Марская рыба з ласосяў | Дэкрэт | Самая буйная пустыня | Хімічны элемент | Султанат у Азіі | Вадкая страва | Вельмі тонкі блін | Рухаецца без матора | Засцерагае ад дажджу | Мясная страва | Журба, маркота | Машына для апрацоўкі металу | Старажытная зброя | Кветка, фота 2 | Яе сталіца - Ліма | Невялікая адтуліна, шчыліна | Паветраны шлях | Ільдзіна на рацэ | Нізкі дзіцячы голас | Піянеры аднаго класа | Вялікі сюррэаліст | Пачуццё меры | Шарэнга | Род флейты | Мяч у варотах | Аповесць Л. Талстога

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (9 снежня). Па гарызанталі: Фантан. «Выбар». Дэкан. Отс. Млын. Трус. Унук. Пліс. Гама. Алюр. Катафот. Об. Брус. Лапа. Макао. Галон. Матавіла. Ікс. Ранак. Рак. Атара. Аўтамат. Лато. Рэлін. Клёкат. **Па вертыкалі:** Картка. Амфітэатр. Скат. Спроба. Талі. Бром. Раман. Надомнік. Апарат. Сакс. Каток. Гар. Нуга. Лава. Брно. Нафталін. Трумо. Пола. Рапс. Кат. Анакрэонт.

Міжнародны клуб

НАШЫ ПАРТНЁРЫ— ТУРЦЫЯ І ПОЛЬШЧА

Інфармацыйны цэнтр і пастаянная экспазіцыя

Пытанні ўзаемных паставак беларускіх і турэцкіх тэкстыльных вырабаў у 2007 годзе, а таксама перспектывы ўдзелу турэцкіх кампаній у рэалізацыі беларускіх інвестыцыйных праектаў, арыентаваных на мадэрнізацыю прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці Беларусі, былі ў цэнтры ўвагі ў ходзе візіту ў Турцыю прадстаўнікоў Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці «Беллегпрам».

Па выніках перамоў у турэцкай асобай прамысловай зоне «Осцім» дасягнута дамоўленасць аб стварэнні на базе гэтай зоны беларускага інфармацыйнага цэнтра і пастаянна дзеючай экспазіцыі тавараў беларускай вытворчасці.

Барыс ЗАЛЕСКІ, дырэктар РІА «Міжнародны клуб».

ООО "FORKLIFT" -- импортер и дистрибьютер погрузчиков "ROCLA" и "NISSAN".
Предлагает ЯПОНСКИЕ ВИЛОЧНЫЕ ПОГРУЗЧИКИ, бывшие в употреблении, "NISSAN" и "TOYOTA", а также ЗАПАСНЫЕ ЧАСТИ И ВИЛЫ ДЛЯ ПОГРУЗЧИКОВ.



Piaseczno, k/o Warszawy, Polska / Польша.
Тел.: 8-10-48-22-737-15-23.
Факс: 8-10-48-22-737-15-22.
E-mail: biuro@forklift.pl
www.forklift.pl



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА НА АУКЦИОНЕ

ЗАО «ВЦ, АКВАБЕЛ» Минский район проводит открытый аукцион по продаже объекта недвижимого имущества:

№ лота	Наименование объекта недвижимости	Общая площадь, м кв.	Начальная цена с НДС, бел.руб.	Адрес объекта
1	Свинарник № 1	1521,9	154 385 714	Минский район, район д. Лесковка

Задаток в размере 10% от стоимости лота перечисляется на р/с № 3012204960010 в филиале ОАО «Белагропромбанк» МГД г. Минск, ул. Ольшевского, 24, код 963, УНН 600438617, ОКПО 28976346, ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Аукцион состоится 22 декабря 2006 г. в 11.00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.12.2006 г. до 17.30 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости.

Контактный телефон: (8-017) 237-93-93.

Открытое акционерное общество «МинскСортСемОвощ»

производит выплату дивидендов в течение месяца, начиная с **26 декабря 2006 г. с 8 до 17 часов** (кроме субботы и воскресенья) по адресу: **г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1.**

Акционерам, не работающим в ОАО «МинскСортСемОвощ», дивиденды будут перечислены на лицевые счета в АСБ «Беларусбанка» по месту обмена чеков «Имущество» на акции.

Згубленую пячатку садаводчага таварыства «Ветэран» (К.П. Нарач) ***лічыць несапраўднай.***

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.22	15.48	7.26
Віцебск —	8.19	15.30	7.11
Магілёў —	8.13	15.38	7.25
Гомель —	8.01	15.43	7.42
Гродна —	8.36	16.04	7.28
Брэст —	8.28	16.13	7.45

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Савы, Сафрона, Фёдара;*
К. *Альбіны, Эўсэбіюша, Здзіслава.*

Надвор'е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+6 — +8 °C	МАСКВА	+2 — +4 °C
ВІЛЬНЮС	+3 — +5 °C Без ападкаў	РЫГА	+1 — +3 °C Без ападкаў
КІЕЎ	+5 — +7 °C Без ападкаў	С-ПЕЦЯРБУРГ	+1 — +3 °C Без ападкаў

Асцярожна: магнітныя буры

У выніку чарговай моцнай успышкі на Сонцы на Зямлі назіраецца ўзрушэнне магнітнага поля. У гэтай сувязі медыкі рэкамендуюць метэаадчувальным людзям быць больш уважлівымі да свайго здароўя.

Як адзначыла ў гутарцы з **карэспандэнтам БЕЛТА загадчыца кафедры агульнай урачэбнай практыкі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алена ВАРАНКО**, гіпатонікам і гіпертонікам, а таксама людзям, якія пакутуюць ад артрыту, артрозу і ішэмічнай хваробы сэрца, у бліжэйшыя дні трэба быць больш уважлівымі да свайго самаадчування, не перанапружвацца. У перыяд павышанай геамагнітнай актыўнасці пажылым людзям таксама рэкамендуецца больш часу праводзіць на свежым паветры і па магчымасці не абцяжарваць сябе хатнімі справамі.

Вядома, што моцная магнітная бура можа адбіцца на рабоце радыёстанцый, электрасетак, спадарожнікавых каналаў.

16 снежня

Дзве даты

1950 год — прэзідэнт ЗША Г. Трумэн аб'явіў у краіне надзвычайнае становішча ў сувязі з пагрозай «камуністычнага імперыялізму».

1876 год — нарадзіўся Яўген Уладзіміравіч Клумаў, беларускі вучоны-медык, удзельнік Мінскага патрыятычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. З восені 1941 года актыўна дапамагаў партызанам, за што быў арыштаваны і ў 1944 годзе разам з жонкай пакараны смерцю. Яго імем у Мінску названы вуліца, завулак і 3-я гарадская клінічная бальніца, на будынку якой установлена мемарыяльная дошка.

Цытата дня:

«Свет існуе для чалавека. Чалавек жыве для свету».

Арабская прымаўка.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РЫХТУЕМСЯ ДА СВЯТА

Што табе падарыць?

Напэўна, Новы год — адзінае свята, да сустрэчы якога рыхтуецца ўвесь свет загадзя. Ужо за месяц вуліцы гарадоў ператвараюцца ў казку — усюды зіхацяць рознакаляровыя гірлянды, красуюцца вялізныя прыгожа ўбраныя ёлкі. І ў кожным доме з нецярпеннем чакаюць гэтага свята. Адна з традыцый, якая трывала замацавалася да нашых дзён, — дарыць падарункі блізкім і сябрам.

Раней лепшым падарункам лічылася кніга. Цяпер, як сведчаць апытанні, большасць жанчын і мужчын шчыра радуюцца, калі ім дораць... касметыку.

Аказваецца, у сярэднім кожная наша жанчына расходуе на касметычныя сродкі ўсяго толькі 30 долараў у год, а вось жыхаркі Еўропы — не менш чым 160. Таму добры набор касметыкі (пажадана адной лініі) — выдатны падарунак да Новага года, і не толькі жанчынам.

Аднак тут ёсць свае «падводныя плыні». Як вы думаеце, што можа ўваходзіць у такі набор? Як лічаць спецыялісты, для жанчын, напрыклад, будуць прыдатнымі сродкі догляду цела, гель для душа ці пена для ванны. А вось ад крэмаў, на якіх напісана «Ад маршчын» ці «Ад прышчоў», у якасці падарунка лепш адмовіцца, каб не пакрыўдзіць чалавека. Калі ж вы хочаце ўсё ж падарыць менавіта крэм, то выбірайце пажыўныя і ўвільгатняльныя, якія будуць прыгодныя для ўсіх тыпаў скуры. Да іх можна дадаць сродкі для зняцця макіяжу, скраб, ачышчальны тонік. Або туш. Не рэкамендуецца дарыць парфуму, бо выбар паху — справа вельмі асабістая (за выключэннем выпадкаў, калі вы дакладна ведаеце, які пах чалавеку падабаецца). Гэтак жа, як і пакупка ценяў і губной памады (вельмі цяжка правільна падабраць патрэбны тон).

Для мужчын у касметычны набор могуць уваходзіць добры дэзадарант, пена для галення, іншыя сродкі догляду сябе, таксама пажадана адной касметычнай лініі.

Заўсёды трэба памятаць, што занадта дарагім падарункам. у тым ліку і касметычным, лёгка паставіць таго, каму ён прызначаны, у нявыгадную становішча. Чалавек, які атрымае такі падарунак, будзе адчуваць сябе абавязаным.

Не менш важна не толькі правільна выбраць падарунак, але і паднесці яго. Каментарыі тыпу: «Увесь дзень прабегала па магазінах, нічога лепшага не знайшла» зусім недарэчны. Але і нахвальваць свой падарунак не варта. Не трэба таксама расказваць аб тым, дзе ён набыты і колькі каштуе. Лепш за ўсё сказаць некалькі добрых прыемных слоў, можна прачытаць падыходзячы да выпадку жартаўлівы верш. Той, хто атрымаў падарунак, павінен адразу ж разгарнуць яго, разгледзець і падзякаваць, а яшчэ сказаць, што іменна аб гэтай рэчы вы даўно марылі. Катэгарычна забараняюцца фразы: «Ну навошта вы патрацілі так многа грошай» ці «Дзякуй, але ў мяне ўсё ёсць».

ВАЖНЫЯ ДРОБЯЗІ

Ваш падарунак абавязкова спадабаецца, калі вы будзеце прытрымлівацца наступных правілаў.

- *Пры выбары падарунка ніколі не выкарыстоўвайце прынцып «аддам тое, што мне не патрэбна».*
- *Памятайце, ёсць прадметы, якія можна дарыць кожнаму, незалежна ад сітуацыі. Гэта цукеркі, фрукты, добрае віно, каньяк, вырабы са шкла, хрусталю, керамікі, скуры.*
- *Яркая святочная папера, каляровыя стужкі зробяць нават самы просты падарунак шыкоўным.*
- *Дарыце падарункі з задавальненнем і ад чыстага сэрца.*

-2374-

Ах, карнавал!

Ну які Новы год без карнавалу? Але вам здаецца, што хутка зрабіць прыгожы карнавальны касцюм для дзіцяці — задача складаная? На самай справе гэта не так. Уважліва паглядзіце на нашы малюнкі, дадайце крыху сваёй фантазіі і — за справу.

БОЖАЯ КАРОЎКА

Спатрэбіцца:

- чырвоная вадалазка
- чорныя штонікі
- невялікі кавалак чорнага аксаміту
- абадок для валасоў
- два кавалкі дроту
- маток чырвоных нітак
- стужка для пояса
- нажніцы, ніткі, іголка
- штучныя кветкі

Што рабіць

З чорнага аксаміту выразаем некалькі кружочкаў аднолькавага памеру, апрацоўваем краі і прышываем да вадалазкі. Рэштамі аксаміту абкручваем дрот і прымацоўваем два пампоны, зробленыя з чырвоных нітак. Прымацоўваем вусікі да абадка і крыху згінаем іх. Падвязваем вадалазку поясам.

РАЗБОЙНІК

Спатрэбіцца:

- белая вадалазка
- жоўтая футболка
- чорныя трыкатажныя штаны
- кавалак баваўнянай зялёнай тканіны
- белы і каляровы шчыльны кардон
- невялікі кавалачак чорнага аксаміту
- мяккая прарызіненая вяровачка
- кавалак чорнай тканіны
- нажніцы, ніткі, іголка

Што рабіць

Зігзагападобна адразаем рукавы і ніз футболкі. Выразаем з каляровага кардону квадраты і прышываем да нізу штаноў, а з белага кардону выразаем кінжал. Кружок з чорнага аксаміту прымацоўваем да мяккай вяровачкі. З чорнай тканіны робім бандану, а з зялёнай — доўгі пояс. Да сярэдзіны банданы прышываем пірацкую эмблему.

Як бачыце, усё вельмі проста. Яшчэ ёсць час падрыхтаваць патрэбны матэрыял і змайстраваць сапраўдны карнавальны касцюм.

ЛЕКАВАЕ ПОЛЫМЯ

У пераднавагоднія дні часцей запальвайце ў доме свечкі. Вазьміце невялікі керамічны ці металічны сподачак, пастаўце свечку ў цэнтры, а вакол яе рассыпце яловыя ці сасновыя шыпулькі. Падобны «араматызатар» выдатна ачышчае паветра ад хваробатворных мікраарганізмаў і негатыўнай энергіі.

-2375-

Тэніс

БІЗНЭСМЕНЫ ВЫХОДЗЯЦЬ НА КОРТ

У выхадныя ў Мінску пройдзе пяты VIP-турнір па тэнісу на прызы Міжнароднага аўтамабільнага холдынга «Атлант-М».

На сталічных кортах у парным разрадзе будуць спаборнічаць каля ста прадстаўнікоў беларускага, расійскага і ўкраінскага бізнэсу. Цікава, што ў парах з аматарамі гуляюць і прафесіяналы: спартсменкі нацыянальнай зборнай Таццяна Пучак (пераможца трох турніраў WTA) і Дар'я Кустава (пераможца 11 турніраў ATF), а таксама Вольга Гаварцова (пераможца Уімблдонскага турніру сярод юніёраў у 2003 годзе). Дарэчы, леташнія спаборніцтвы выйграў дуэт Таццяна Пучак і віцэ-губернатар Ленінградскай вобласці Аляксей Акулаў. Уваход у Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па тэнісу (праспект Пераможцаў, 63) і на корты «Даўгалецця» (Жудро, 40) бясплатны. Пачатак матчаў а 9 гадзіне, заканчэнне сустрэч у 15 гадзін.

Ірына АНАТАВА.

Алімпіяда-2008

Лебедзь, рак і шчупак?

Наколькі падрыхтаваныя беларускія спартсмены да 29-х летніх Алімпійскіх гульняў, да якіх засталося крыху больш чым 600 дзён, высвятлялі на сумесным пасяджэнні прадстаўнікоў Міністэрства спорту і турызму і Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі.

Задача нацыянальнай зборнай праз два гады ў Пекіне — выступіць лепей, чым у Сіднэі ў 2000-м, дзе было заваявана 17 узнагарод, у тым ліку 3 залатыя. «У гэтым годзе нашы атлеты ўдзельнічалі ў 280 міжнародных спаборніцтвах, дзе здабылі ў алімпійскіх відах на 20 узнагарод больш, чым летась. Значыць, ёсць станоўчая дынаміка, — заўважыў міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгараў.

Міністр нагадаў і аб праблемах, якія трэба вырашаць ужо зараз: «У нас няма турбот, звязаных з фінансаваннем, а ёсць дрэнная арганізацыя працы на месцах. Павінен быць пастаянны кантроль у падрыхтоўцы спартсменаў». Сітуацыю, калі атлеты, трэнеры і чыноўнікі працуюць нязладжана, Аляксандр Грыгараў ахарактарызаваў назвай вядомай байкі — «Лебедзь, рак і шчупак», бо кожны цягне ў свой бок, дзейнічае ў сваім накірунку. Асабліва пільнымі ў каардынацыі працы міністр спорту заклікаў быць у наступным годзе, які стане рашаючым: будуць разыгрывацца допускі на Алімпіяду. «Слабых месцаў у падрыхтоўцы не бывае, — адзначыў Аляксандр Грыгараў. — Мы працягваем стварацьаптымальныя ўмовы для спартсменаў. Ужо створана Вышэйшая школа трэнераў, у наступным годзе з'явіцца Нацыянальнае антыдопінгавае агенцтва».

Ірына ПРЫМАК.

УСМІХНЁМСЯ!

Калі пад нагамі ў кватэры сухая гразь, значыць дзеці не мылі падлогу.

Калі гразь вільготная, значыць, памылі.

☺

Толькі наш чалавек, пачуўшы словы «сто грамаў», не пытаецца: «Чаго?»

☺

Маленькі Настрадамус пытаецца ў маці:

— Мама, а што ў нас сёння на абед?

— А быццам ты, нягоднік, не ведаеш...

☺

— Як называецца, калі блондзінка фарбуецца пад брунетку?

— Штучны інтэлект.

☺

Геаметэацэнтр паведамляе, што тэрмін дзеяння прагнозу надвор'я на 1 снежня працягнуты да 20 снежня. Аб заканчэнні тэрміну будзе паведамлена асобна.

☺

— Нешта ты апошнім часам вельмі нервуешся, здарылася што?

— У мяне дурныя прадчуванні.

— У чым справа?

— Мая былая жонка развялася ў трэці раз і зноў выйшла замуж за свайго першага мужа. А я быў другім...

36,6°

ПЕРШЫЯ АХВЯРЫ ПАЛЯЎНІЧАГА СЕЗОНА

Сёлетні паляўнічы сезон зноў прывёў на бальнічны ложак людзей. Як паведаміў урач-паразітолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Андрэй ВЕДЗЯНЬКОЎ, у Мінску ўжо зарэгістравана восем выпадкаў трыхінілёзу. Пацярпелыя — жыхары Брэсцкай вобласці, якія прыехалі пагасцяваць у сталіцу. Паводле іх слоў, крыніцай заражэння стала каўбаса, зробленая з мяса дзіка.

Паколькі напярадзе шмат святаў з багатымі застоллямі, з рознымі прысмакамі, эпідэміёлагі раяць з асцярогай ставіцца да прыгатавання і паядання страў з мяса.

Трыхінілёз — захворванне, якое выклікаецца дробнымі лічынкамі трыхінелы. Яны вызначаюцца асаблівай устойлівасцю да неспрыяльных фактараў. Ні варка, ні смажанне, ні вэнджанне, ні саленне ў поўнай меры не вызваляюць мясапрадукты ад гэтых гельмінтаў. Сімптомы захворвання звычайна з'яўляюцца праз 2—4 тыдні з моманту заражэння, але могуць з'явіцца і праз некалькі дзён. Усё залежыць ад атрыманай дозы ўзбуджальніка і ўстойлівасці арганізма. Пры гэтай хваробе высокая тэмпература (да 39 °С і вышэй), з'яўляюцца мышачныя болі ікраножнай вобласці і ацёкі павек, твару. Часам да сімптомаў далучаюцца скурныя высыпкі і кішэчныя расстройствы. Ступень цяжкасці вельмі разнастайная — ад лёгкіх і сцёртых формаў да цяжкіх ускладненняў, якія, бывае, заканчваюцца смерцю.

Што ж трэба ведаць і якія правілы захоўваць, каб пазбегнуць заражэння трыхінілёзам?

Нельга набываць прадукты харчавання (у дадзеным выпадку мясапрадукты) у невядомых асоб па-за дзяржаўнымі пунктамі гандлю. Купляючы мяса ў камерцыйных лаўках і палатках, патрабуйце даведку аб ветэрынарным даследаванні прадуктаў.

Неабходна таксама клапаціцца аб захаванні здароўя жывёлы на ўласным падворку. Памяшканні, у якіх утрымліваецца свойская жывёла, павінны быць абароненыад пранікнення грызуноў. Перыядычна — вясной і восенню — трэба знішчаць пацукоў і мышэй у жылых і прысядзібных пабудовах. Нельга скормліваць свойскім свінням трупы загінулых дзікіх жывёл, а адходы паляўнічага промыслу — толькі пасля папярэдняй ветэрынарнай экспертызы.

Яшчэ адна мера прафілактыкі. Трэба абавязкова праводзіць паслязабойную ветэрынарную экспертызу туш свойскіх свіней і жывёл і толькі пасля гэтага ўжываць іх мяса ў ежу. Прычым для правядзення такой экспертызы не трэба везці ў ветэрынарную службу ўсю тушу — дастаткова ўзяць пробу мышачнай тканкі (з ножак, дыяфрагмы, міжрэберных, шыйных, жавальных або ікраножных мышц) вагой не больш як 50 грамаў. Акрамя таго, для зручнасці насельніцтва кіраўніцтва ветэрынарнай службы рэспублікі з 2001 года прыцягвае для правядзення трыхінеласкапічнай экспертызы ветэрынарных урачоў жывёлагадоўчых гаспадарак, а для збору проб мясапрадуктаў і цэнтралізаванай іх дастаўкі ў ветэрынарныя лабараторыі — ветэрынарных фельчараў гаспадарак.

Варта ведаць, што калі ветслужбамі ў пробах мяса выяўлены трыхінілёз, то, згодна з дзеючым ветэрынарным заканадаўствам, такая туша канфіскуецца і знішчаецца, грошы за яе не вяртаюцца, даецца толькі даведка, што тавар канфіскаваны. «Таму, — кажа А. Ведзянькоў, — мы раім людзям, якія бяруць на адкорм свіней, страхаваць жывёлу. Гэта будзе гарантыяй таго, што ў падобнай сітуацыі магчыма вярнуць хоць бы частку грошай».

І яшчэ. Даследаваць мяса не позна і праз тыдзень пасля ўжывання ў ежу свежаніны. Калі знойдуцца лічынкі трыхінел, захворванне можна будзе прадухіліць, своечасова звярнуўшыся ў медыцынскую ўстанову, дзе прызначаць прафілактычнае лячэнне. Галоўнае — не спяшайцеся ўсаджваць гасцей за мясны стол, каб потым не было бяды.

Вольга ШАЎКО.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 36.281. Індэкс 63850. Зак. № 6997. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12